Пролетарыі усіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

СУБОТА
19 верасьня 1931 г.
№ 217 (3306)

Пяцідзёньнік павінен даць перамогу

На фронце барацьбы за азімы клін і зяблевае ворыва БССР атрымала рад буйнейшых перамог. Гэтыя перамогі знаходзяць свой выраз у значным павялічэньні плошчы азімага кліну, ва ўзмацненьні тэмпаў зяблевага ворыва ў параўнаньні з мінулым годам.

Але-ж на фоне агульных перамог у справе правядзеньня асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва, на гэтым найадказнейшым вучастку сацыялістычнага наступленьня ёсьць і рад буйных прарываў. Улічваючы гэта, ЦК КП(б)Б абвясьціў пяцідзёньнік штурму па ліквідацыі адставаньняў у выкананьні плянаў асеньняй сяўбы. Пяцідзёньнік штурму павінен унесьці рашучы пералом у справу правядзеньня асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва. **Гэтыя пяць дзён павінны даць канчатковую перамогу на фронце асеньняй сяўбы і па дзесяцярыцьць тэмпы зяблевага ворыва.**

Як-жа на сёньняшні дзень абстаіць справа з асеньняй сяўбой? Апэрацыйныя зводкі, якія мы сёньня друкуем, сыгналізуюць аб тым, што ў правядзеньні асеньняй сяўбы маюцца вялікія адставаньні ня толькі па аднаасобным бядняцка-серадняцкім сэктары, але і па саўгасах і калгасах. Плян сяўбы па становішчы на 15-IX—31 г. выкананы толькі на 52 проц. Наколькі марудна нарастаюць тэмпы сяўбы відаць хоць-бы з таго, што калі на 10 верасьня плян сяўбы быў выкананы на 38,3 проц., дык апошняя пяцідзёнка верасьня дала ўзрост толькі на 13,9 проц.

Апэрацыйныя зводкі і матар'ялы гавораць нам і аб тым, што частка раёнаў ужо выканала пасеўныя пляны, што значная частка раёнаў набліжаецца да іх выкананьня. **Блісьнучы прыклад таго як трэба змагацца за азімы клін паказаў Чырвонаслабодзкі раён, які па становішчы на 10 верасьня поўнасьцю выканаў свой плян асеньняй сяўбы.** Побач з раёнамі, якія па бальшавіцку змагаюцца за поўнае выкананьне плянаў, мабілізуюць важол гэтай справы ўсе свае сілы,—ёсьць і такія раёны, якія паставілі выкананьне плянаў асеньняй сяўбы пад пагрозу поўнага зрыву.

Асабліва ганебна працягваюць плесьціся ў хвасьце барацьбы за бальшавіцкую асеньнюю сяўбу такія раёны, як Любаньскі (5,6 проц.), Тураўскі (0,8 проц.), Стара-Дароскі (5,9 проц.). Зараз уся справа зводзіцца к таму, каб выраўняць лінію фронту барацьбы за азімы клін. Гэта павінна быць зроблена за лік ліквідацыі прарываў у тых раёнах, якія да гэтага часу працягваюць адставаць.

Мімаволі паўстае пытаньне, чаму побач з раёнамі, якія ўжо выканалі пасеўныя пляны, набліжаюцца да іх выкананьня, ёсьць і такія раёны, у якіх прарывы ў справе правядзеньня асеньняй сяўбы ня толькі не памяншаюцца, а наадварот яшчэ больш і больш павялічваюцца? Дзе тояцца прычыны такіх ганебных прарываў? Гэтыя прычыны тояцца, бязумоўна, не ў абставінах аб'ектыўнага парадку. Кожны раён мае ўсе ўмовы для таго, каб ня толькі выканаць, але і перавыканаць ва ўстаноўлены тэрмін пляны асеньняй сяўбы. Гэтыя прычыны тояцца ў няздольнасьці некаторых кіраўнікоў памянёных партыйных арганізацый, райвыканкомаў стаць на чале мас у барацьбе за азімы клін, за выкананьне плянаў зяблевага ворыва. Стаўка на самацёк, якая перарасла ў апартуністычную практыку—вось галоўны вораг бальшавіцкіх тэмпаў у справе правядзеньня гэтых найадказнейшых палітычна-гаспадарчых кампаній.

Аб тым, што пляны асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва зусім рэальны, аб тым, што гэтыя пляны можна ня толькі выканаць, але і перавыканаць, кажуць нам атрыманыя перамогі радам МТС на гэтым найадказнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва. Такія МТС, як Лепельская, Мсьціслаўская, Аршанская, Клімавіцкая, Касьцюковіцкая і Койданаўская ня толькі выканалі, але і перавыканалі пляны асеньняй сяўбы і з посьпехам змагаюцца за выкананьне плянаў зяблевага ворыва. Праўда, побач з такімі МТС, якія выканалі і перавыканалі свае пляны, набліжаюцца да іх выкананьня, ёсьць і такія МТС, якія іх недавыканалі ад 20 да 45 проц. МТС—фарпосты сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі могуць і павінны ў самы бліжэйшы тэрмін поўнасьцю ліквідаваць прарывы, якія маюцца і ў іх рабоце па правядзеньні асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва.

Выканаць плян асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва—баявая задача. Выкананьню гэтай задачы павінны быць падначалены ўсе сілы і сродкі. Побач з упорам на скончэньне сяўбы на працягу бліжэйшых пяці дзён павінна быць зьвернута самая сур'ёзная ўвага на фарсыраваньне тэмпаў зяблевага ворыва з тым, каб гэта кампанія была таксама скончана на працягу бліжэйшага тэрміну. Дырэктывы партыі і ўраду аб пераключэньні 80 проц. трактароў і 30 проц. коняй выключна на зяблевае ворыва павінны быць абавязковa выкананы.

Толькі пры ўмовах самай шырокай мабілізацыі саўгасьнікаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў могуць быць выкананы дырэктывы партыі і ўраду па пытаньні правядзеньня асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва. У рашучай барацьбе з кулацкім і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі можа быць атрыманы на канчатковая перамога і на гэтым баявым вучастку.

Апэрацыйнае кіраўніцтва, правільная расстаноўка сіл, рацыянальнае выкарыстаньне інвэнтара, хуткая ліквідацыя ўсіх узьнікаючых недахопаў і недарэчнасьцяй, арганізацыя працы на аснове ўвядзеньня зьдзельшчыны—вось што вырашае посьпех асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва.

Партыйныя арганізацыі і райвыканкомы гэта павінны забясьпечыць.

Даць бульбу пралетарскім цэнтрам

Загатоўцы бульбы і гародніны—бальшавіцкія тэмпы

Неадкладна наладзіць вучот загатовак і адгрузку бульбы і гародніны

Надышоўшы рашучы пэрыяд загатовак бульбы і гародніны патрабуе ад усёй сыстэмы спажывецкай каапэрацыі, пачынаючы ад нізавых зьвеньняў і канчаючы рэспубліканскім аб'яднаньнем «Белкаапсадгародніна», па-баявому ўзяцца за выкананьне даных партыяй і ўрадам плянаў загатовак і адгрузкі. Гэта важнейшае пытаньне вучоту ходу загатовак і адгрузкі бульбы прамысловым гарадом да гэтага часу знаходзіцца ў агідным становішчы. Амаль ва ўсіх зьвеньнях сыстэмы спажыўкаапэрацыі няма адказных таварышоў за вучот гэтай работы. Ёсьць рад раёнаў, якія нядбайна адносяцца да справы дачы зводак аб становішчы загатовак і адгрузкі бульбы. Напрыклад, Барысаўскі, Бягомльскі, Бярэзінскі, Дубровенскі, Камарынскі, Койданаўскі і Полацкі райспажыўсаюзы з самага пачатку загатовак зусім не прадставілі зводак, ня гледзячы на неаднаразовыя патрабаваньні Белкаапсаюзу.

Ня лепш абстаіць справа вучоту і ў самым аб'яднаньні Белкаапсадгародніны. Апарат не падрыхтаваны і не набліжаны на надыходзячыя масавыя загатоўкі і на апрацоўку вучотных даных. У выніку адсутнасьці зводак і недыцыплінаванасьці райспажыўсаюзаў няма дакладнага малюнку ходу загатовак і выкананьня плянаў.

Трэба карэнным чынам перабудаваць апараты райспажыўсаюзаў і Белкаапсадгародніны, рашуча павярнуўшы іх да выкананьня плянаў бульбазагатовак і дакладнага вучоту. Трэба дабіцца чоткай работы ўсяго апарату, і паасобных раённых работнікаў у выкананьні дырэктыў партыі і ўраду, аб бульбазагатоўках. Тыя раёны, якія добра выконваюць пляны бульбазагатовак, трэба прэм'яваць.

Трэба ліквідаваць абязьлічку ў рабоце спажыўсыстэмы, дабіцца поўнай адказнасьці ўсіх раёнаў і кожнага работніка паасобку за выкананьня імі работы.

З боку Белкаапсадгароніны няма належнага кіраўніцтва і інструктаваньня работы райспажыўсаюзаў, у выніку чаго весткі, дасыланыя апошнімі вельмі часта бываюць блытанымі і ў іх вельмі цяжка разабрацца.

Трэба пакласьці рашучы канец недаацэнцы вучоту загатовак і адгрузкі бульбы і гародніны.

С. Д.

Вялізарныя магчымасьці перапрацоўкі гародніны не скарыстоўваюцца

Белкаапсаюз ня кіруе гэтым вучастакам работы.

Нябывалы ўраджай садовіны і гародніны сустрэў зусім непадрыхтаваным апарат Белкаапгародніны. Ня гледзячы на разгар кампаніі па перапрацоўцы, квашаньні гародніны і сушкі садовіны, да гэтага часу няма спэцыяльна на вылучанага работніка. Сушыльныя заводы ЦРК працуюць без кіраўніцтва цэнтру. Аб'яднаньне Белкаапгароднины ня ведае дакладна, колькі загатоўлена і перапрацавана гародніны і садавіны. Гэта важнейшая работа прадастаўлена месцам, якія павінны варыцца ў сваім уласным соку. Надзвычай дрэнна абстаіць справа з тарай. Амаль з усіх райспажыўсаюзаў пасту паюць запатрабаваньні аб прысылцы тары, але ўсё гэта застаецца без увагі. Справе пераапрацоўкі гародніны і садавіны не аддаецца ўвага з боку Белкаапсаюзу. Магчымасьці разьвіцьця пераапрацоўкі гародніны і садавіны вялізарныя, але яны не скарыстоўваюцца непаваротлівымі каапэратарамі.

С. Х.

Дамагчыся рашучага пералому

Ня гледзячы на дырэктывы партыі і ўраду аб масавай копцы і загатоўцы бульбы паасобныя раёны ня толькі не прыступілі да выкананьня даных дырэктыў, але і зусім не падрыхтаваліся да правядзеньня бульбазагатоўчай кампаніі, напрыклад: буйнейшыя раёны, дзе вядуць загатоўку райспажыўсаюз (Уварвацкі, Клічаўскі, Шклоўскі і інш.), дагэтуль не змаглі поўнасьцю давесьці пляны да нізоў, ня ўлічаны кулацка-заможныя гаспадаркі (Уваравічы). Не праведзена масавая падрыхтоўчая і растлумачальная работа, сельсаветы недастаткова дапамагаюць у давядзеньні пляну і праверкі выкананьня заданьняў кулацка-заможнымі гаспадаркамі (Шклоў).

Трэба безадкладна ўсім сельсаветам і сельспажыўтаварыствам мабілізаваць усю калгасную бядняцка-серадняцкую масу вёскі на безадкладную копку бульбы і выкананьне дадзеных заданьняў. Трэба прымусіць кулацка-заможныя гаспадаркі поўнасьцю і ў тэрмін выканаць дадзеныя ім заданьні. Раённыя партыйныя арганізацыі і райвыканкомы павінны тэрмінова мабілізаваць усю актыўную частку раёну на рашучую барацьбу за бальшавіцкія тэмпы выкананьня пляну па выкапцы і загатоўцы бульбы, трэба даць рашучы адпор паасобным апартуністычным разважаньням аб немагчымасьці выкананьня пляну і пачатку копкі.

С. Д.

Клімавіцкі раён па-баявому рыхтуецца да загатовак бульбы і гародніны

Ход падрыхтоўкі да ўборкі бульбы і гародніны і загатоўкі гэтых культур па Клімавіцкім раёне праходзіў вельмі нездавальняюча.

Такое становішча выявілася на пасяджаньні бюро РК 12 верасьня і з боку апошняга ўжыты рад практычных мерапрыемстваў для забясьпячэньня свячасовай уборкі і адгрузкі бульбы і гародніны рабочым цэнтрам. Вось важнейшыя з гэтых мерапрыемстваў: у трохдзённы тэрмін распрацаваць і давесьці да калгасаў і саўгасаў канкрэтныя заданьні па ўборцы бульбы і гародніны, распачаўшы ўборку не пазьней 20 верасьня і закончыўшы не пазьней як 10 кастрычніка. Вакол пытаньняў уборкі і адгрузкі бульбы і ўтварэньня патрэбных насенных, страхавых і інш. фондаў мабілізаваць грамадзкую думку, правесьці сходы калгасьнік і аднаасобнік. Падрыхтаваць адпаведныя матар'ялы па каапэраваньні бульбы і кораньплодаў з тым, каб не дапусьціць памылак мінулага году.

У трохдзённы тэрмін давесьці пляны бульбазагатовак да калгасаў, паасобных паселіш, двароў, забясьпечыць поўнае выкананьне дагавораў па кантрактацыі. Здача бульбы і гародніны павінна адбывацца непасрэдна ў пэрыяд уборкі з поля—на завод, на здатачны пункт. Райсаюз і райкаапсаюз, саўгасы і вінбровары павінны свае часова падрыхтавацца да прыёмкі бульбы і гародніны з такім разьлікам, каб паступаючая бульба поўнасьцю прымалася ў дзень дастаўкі. Прымаваньне здатчыкаў (калгасаў і аднаасобнікаў) да пункта здачы праверыць і паставіць так, каб ня было сустрэчных перавозак.

Па лініі Райкаапсаюзу забясьпечыць арганізацыю ўборкі бульбы на аснове поўнай зьдзельшчыны з давядзеньнем нормы зьдзельшчыны да кожнага калгасьніка, прымацаваньнем пэўных груп калгасьніц і калгасьнікаў да пэўных плошчаў.

Вакол пытаньняў уборкі і адгрузкі бульбы і гародніны ўзьнята ўся грамадзкасьць — камсамол, прафсаюзы, дэлегацкія групы. На аснове гэтай актыўнасьці трэба даматчыся свячасовага і поўнага выкананьня пляну загатовак і адгрузкі бульбы.

В. Бальзоўскі.

Прыцягнуць да адказнасьці Чырвонаслабодзкіх галавацяпаў

Дырэктыву Наркамснабу ад 4-VIII аб новых загатоўчых цэнах на бульбу, Чырвона-Слабодзкі райснаб, атрымаўшы па тэлеграфе, разаслаў загатоўчым арганізацыям толькі 14-VIII. Да гэтага дня загатоўчыя арганізацыі ўзмоцнена вялі загатоўкі бульбы па ранейшых, значна вышэйшых цэнах. Калі прышлося разьлічвацца, Белсадгародніна лічыла загатоўленую бульбу па новых расцэнках, у выніку чаго сельспажыўтаварыствы засталіся пры значных стратах і ня ведаюць цяпер крыніц, з якіх пакрыць гэтыя страты.

Па аднэй спажывецкай каапэрацыі страты ад розьніцы ў цэнах на бульбу, паводле прыблізных падлікаў, складаюць каля 2.000 руб.

Адпаведным органам неабходна заняцца гэтай справай і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Вока

Пастанова ЦК КП(б)Б

аб палітычных памылках Лельчыцкай раённай газэты „Калгасьнік на варце"

1. Сакратарыят ЦК КП(б)Б адзначае, што ў рабоце газэты «Калгасьнік на варце» меўся рад апартуністычных памылак, асноўныя з якіх наступныя:

а) Газэта «Калгасьнік на варце» невыстарчальна і нерашуча мабілізавала партарганізацыю раёну на барацьбу за генэральную лінію партыі і, у прыватнасьці—не змагалася супроць правай, галоўнай небясьпекі, а таксама супроць «левых» загібаў (маўчаньне газэты пры парушэньні ленінскага прынцыпу добраахвотнасьці ў пытаньнях калектывізацыі і інш. скажэньнях партыйных дырэктыў у рабоце савецкіх судовых і інш. арганізацый). Кіраўніцтва газэты, якое дапусьціла апартуністычную недаацэнку ў пытаньнях барацьбы на два франты з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, недаацаніла фактаў грубага парушэньня партыйных дырэктыў пры правядзеньні асноўных гаспадарча-палітычных кампаній у раёне, праявіла поўную бязьдзейнасьць у пытаньні разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі ў партарганізацыі і не ўзьняла пытаньня барацьбы з ухіламі на прынцыповую палітычную вышыню, абярнуўшы газэту ў фіксатара асобных фактаў і зьявішч.

б) Кіраўніцтва газэты паказала сваю няздольнасьць мабілізаваць партарганізацыю на канкрэтныя прыклады барацьбы супроць усіх скажэньняў лініі партыі ў пытаньнях калектывізацыі і выпраўленьня буйных палітычных памылак у рабоце партарганізацый, саветаў і інш. органаў, не зьмясьціўшы на працягу цэлага м-ца, ужо пасьля правядзеньня абсьледваньня ЦК, ніякіх матар'ялаў выкрываючых правую практыку і буйныя парушэньні ленінскага прынцыпу і добраахвотнасьці ў калгасах.

в) Газэта не змагалася за спэцыяльную зацыю свайго раёну.

г) Газэта «Калгасьнік на варце», зьмясьціўшы адозву РК КП(б)Б (№ 5 ад 1-га мая), у якой партарганізацыя арыентуецца на «левыя» загібы («а зараз мы сталі напярэдадні суцэльнай калектывізацыі») дапусьціла грубую палітычную памылку «лявацкага» парадку.

д) Улічваючы, што газэта «Калгасьнік на варце» ў сваіх апошніх нумарох прызнаўшы свае апартуністычныя памылкі, стала на шлях іх выпраўленьня, абмежавацца абвяшчэньнем вымовы рэдактару газэты «Колгасьнік на варце» тав. Лебедзеву.

2. Прапанаваць Культпропу ЦК неадкладна ўзмацніць кіраўніцтва газэты «Калгасьнік на варце» моцнымі, бальшавіцка - вытрыманымі работнікамі. Прыцягнуць да партадказнасьці пазаштатнага інструктара прымацаванага да Лельчыцкай газэты.

3. Прапанаваць рэдакцыі газэты «Калгасьнік на варце» рашуча перабудаваць сваю работу па мабілізацыі раённай партарганізацыі на барацьбу супроць адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі, змагаючыся за арган.-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

4. Пастанову апублікаваць у друку.

Вялікія хваляваньні ў ваенным флёце Англіі

Флёт у руках матросаў. Дзеяньнямі матросаў кіруюць выбарныя камітэты

ЛЁНДАН. 16-IX. Учора ўвечары атлянтыцкі флёт атрымаў загад зьвярнуцца ў Чэттен, Дэвартпорт і Пэртсмундт, парты сталай стаянкі ваенных судоў. — Аднак, матросы адмовіліся падначаліцца.

Рух у флёце праходзіць выключна арганізавана і дысцыплінавана.

На большасьці суднаў дзеяньнямі матросаў кіруюць выбарныя камітэты. Па ініцыятыве камітэтаў выпушчан маніфэст, у ім зьмяшчаецца наступная катэгарычная заява: «калі ня будзе атрымана гарантаваная марскім міністэрствам і падцьверджаная парлямантам згода на перагляд нашых ставак, мы парашылі стаяць усе як адзін, адмаўляемся плаваць да зацьверджаньня новых ставак». Учора на працягу дню на ўсіх суднах адбываліся мітынгі.

Паводле слоў карэспандэнта лейбарыстскай «Дэйлі Геральд» учора флёт быў у руках матросаў. Ніводзін загад ня выконваўся.

Трэцяга дню раніцою быў крытычны момант.

Калі быў даны сыгнал да адплыцьця на манэўры, вочы ўсіх матросаў на судах, разьмешчаных у Інвэнгардоне, былі зьвернуты на броняносец «Вэдэрэн», які павінен быў выйсьці першым. Калі-б браняносец зьняўся з якара, барацьба магла быць зламанай. Камандзір «Вельента» аддаў загад падняць якар, аднак каманда адмовілася падначаліцца. Тады афіцэры самі спрабавалі падняць якар. Матросы не супярэчылі, але заявілі, што калі афіцэры паднімуць якар, дык матросы кінуць другі якар. Гэта парашыла справу і ўвесь флёт застаўся на месцы.

Афіцэры больш ня супярэчылі распараджэньням выбарных камітэтаў і кіраўнікоў руху. Паводле распараджэньня камітэтаў, на судах праводзіліся толькі работы, зьвязаныя з харчаваньнем каманды. Камітэты забаранілі афіцэрам мець сувязь з берагам і даць лодкі для паездак у горад. Суднны «Уортвал», «Малайя», якія выйшлі ў мора да пачатку хваляваньня, потым зьвярнуліся ў Інвэнгорд і далучыліся да суднаў, ахопленых рухам.

Пытаньні аб хваляваньнях у палаце вобшчын

ЛЁНДАН. 17-IX. Рэйтэр паведамляе: «у палаце вобшчын у часе спрэчак па пытаньні аб падзеях у атлянтычным флёце, марскі міністр Чэмбэрлен заявіў, што хоць дзеяньні экіпажаў апраўдаць нельга, ўсё-ж ход падзей выкрыў, што ў рэзультаце агульнай дысцыпліны падзеі прайшлі спакойна. У заключэньне Чэмбэрлен зазначыў, што да маракоў зьвернуты заклік, у якім гаворыцца, што яны не падпадуць рэпрэсіям.

«Мінулае—ёсьць мінулае, заявіў Чэмбэрлен, і ў інтарэсах усіх забыцца аб ім. Мы разам пойдзем наперад».

Выступіўшы пасьля Чэмбэрлена былы марскі міністр і лейбарыстскім габінэце Макданальда Александэр рэзка спрачаўся супроць вэрсіі Чэмбэрлена аб падзеях на флёце. Пры гэтым ён дадаў, што былы габінэт быў папярэджан адміралцействам і палітычнымі кіраўнікамі флёту аб небясьпецы, якая з таго часу ператварылася ў жыцьцё.

ЛЁНДАН 17-IX. Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «выступаючы ў палаце вобшчын, марскі міністр Чэмбэрлен на пытаньне, ці была ў свой час дана былым лейбарыстскім урадам згода на правядзеньне зьніжэньня заработку, адказаў, што калі ён зьявіўся ў марское міністэрства, ён ужо знайшоў там інструкцыі аб зьмяншэньні заработку (рух у залі і гучныя воплескі на міністэрскіх лаўках).

ЛЁНДАН. 17-IX. Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «У палаце вобшчын вялікую сэнсацыю выклікае выступленьне Макданальда, які, адказваючы на пытаньні, што датычуцца зьніжэньня заработку ў ваенным флёце, заявіў: «былому лейбарыстскаму ўраду было паведамлена марскім міністэрствам аб тым, што матросы дайяльна замірацца са зьніжэньнем свайго заработку пры ўмове выкананьня двух рэчаў: адначасовага зьніжэньня ўсіх дзяржаўных служачых і адпаведнага скарочаньня дапамогі беспрацоўным».

Рэвалюцыйны ўплыў падзей у Ангельскім флёце

НЬЮ-ЁРК. 17-IX. Паведамленьні аб падзеях у ангельскім ваенным флёце выклікалі вялікую трывогу буржуазнага друку, які ў сваіх камэнтарыях выкрывае поўную замяшанасьць, нападае на Гендэрсона і лейбарыстаў, адмаўляе факт мецяжа і зводзіць падзеі да простага пратэсту супроць зьніжэньня заработку. Орган кампартыі «Дэйлі Уоркер» заклікае аказаць падтрыманьне ангельскім маракам.

БЭРЛІН. 17-IX. Мяцеж ангельскіх матросаў зрабіў моцнае ўраджаньне на нямецкую грамадзкасьць. Буржуазныя газэты спрабуюць змазаць палітычнае значэньне мяцежу: «Ротэ Фанэ» камэнтуючы мяцеж у ангельскім флёце, зазначае, што ён зьяўляецца міжнародным сыгналам: «Гэта першае буйнае паўстаньне флёту з часу сусьветнай вайны, з часу паўстаньня нямецкага ваеннага флёту, пасьля Кранштадту 1917 г.». Рэвалюцыйны ўплыў мецяжу распаўсюджваецца за межы Эўропы.

«Можна лёгка сабе ўявіць,—піша «Ротэ Фанэ»,—як кітайская чырвоная армія, якой даводзіцца змагацца пад агнём ангельскіх ваенных караблёў, будзе радавацца, калі ангельскія матросы, наперакор загадам сваіх афіцэраў, спыняць агонь і накіруюцца дамоў. Можна сабе ўявіць, як рэвалюцыйныя масы лёгка ўздыхнуць, калі ваенныя караблі, якія транспартуюць усё новыя дывізіі ангельскага войска ў індыйскія гавані, ня будуць пагражаць рэвалюцыйным гаваням Індыі і пройдуць у рукі паўстаўшых матросаў».

БЭРЛІН. 17-IX. Правы друк спрабуе ацэньваць мяцеж ангельскіх маракоў, як «няпрыемны інцыдэнт», узьніклы з-за зьніжэньня заработку маракам, але які зьніжае прэстыж «гордасьці Англіі», прэстыж ангельскага флёту.

«Фосышэ Цэйтунг» піша: «бязумоўна гутарка ідзе аб заработку, але разам з тым бязумоўна ясна і тое, што сярод кіраўнікоў мяцежа знаходзяцца людзі, перад вачыма якіх жыве прыклад браняносца «Пацёмкіна» калі яны падпальвалі забастоўку.

Вялікая трывога ва ўрадавых колах

ЛЁНДАН. 15-IX. Хваляваньні ў ваенным флёце выклікалі ў палітычных колах вялікую трывогу. Учора на працягу дню Макданальд двойчы склікаў экстранае паседжаньне габінэту для абгаварэньня стварыўшагася становішча. Падзеі гэтыя выклікалі ўзбуджэнные паліцыі. Ва ўсіх цэнтрах разьмяшчэньня воінскіх часьцей салдаты ажыўлена абгаварваюць пытаньне аб новых стаўках. З розных месц паступаюць весткі аб узрастаючым незадаволеньні сярод салдат.

Камандуючы войскам генэрал Гарынгтон у сваім дакладзе ўраду выказаў надзею, што «армія не пойдзе па прыкладзе Атлантычнага флёту».

Вялікае нездаволеньне зьніжэньнем ставак наглядаецца таксама сярод паліцэйскіх. Учора адбыўся вялікі мітынг у паліцэйскіх раёнах Сіці (дзелавы квартал Лёндану). На мітынзе прынята рашэньне паслаць пратэст супроць зьніжэньня заработку паліцэйскіх. Удзельнікі мітынгу даручылі цэнтральнаму камітэту паліцэйскай фэдэрацыі патрабаваць перагляду ўрадавых мер у адносінах да паліцыі.

ЛЁНДАН. 17-IX. Біржа рэагавала на падзеі ў флёце рэзкім падзеньнем ангельскіх папер.

Пераход на тэрыторыю СССР працоўных Польшчы ня спыняецца

ВАРШАВА. 16-IX. У сувязі з імклівым ростам беспрацоўя ў Польшчы і жахлівай беднасьцю, у якой жывуць шырокія масы працоўных, усё пачашчаюцца выпадкі пераходу цэлых груп рабочых і сялян, а таксама адзінак, праз савецкую граніцу, у пошуках работы ў СССР.

Гэтымі днямі ў раёне Докшыц польскі пагранічны патруль цяжка параніў стрэлам селяніна, які спрабаваў перайсьці на савецкую тэрыторыю.

Мэмарандум па пытаньні ўзброеньня Польшчы ў Лізе Нацый

ВАРШАВА, 17-IX. «Газэта Польска» паведамляе, што польскаму пасольству ў Маскве даручана паведаміць савецкаму ўраду, што польская дэлегацыя ў Жэневе падала генэральнаму сакратару Лігі Нацый мэмарандум па пытаньні аб узброеньні Польшчы.

СЯМЕЙНАЯ СВАРКА ЎЛАДЖАНА

Неабходнасьць выслужыцца перад францускім імпэрыялізмам заставіла ўрадавыя колы і верных служак з партыі Отто Баўэра пасьпешна ўладзіць унутрысямейныя справы, са спробай фашысцкага перавароту, бо францускай біржа пэўне не згадзілася-б крэдытаваць урад з орыентацыяй на Італію.

(З газэт).

Сацыял-дэмакрат: Ся... не шуміце... Француская біржа... можа разгневацца...!

На абарону рэвалюцыйных вязьняў польскага фашызму

ПАРЫЖ, 16-IX. „Юманітэ" апублікавала тэкст тэлеграмы, пасланай Страсбурскімі арганізацыямі таварыства прыхільнікаў СССР польскаму генэральнаму консулу ў Парыжы.

У гэтай тэлеграме страсбурскія арганізацыі выказваюць сваё абурэньне з прычыны існуючага ў Польшчы турэмнага рэжыму для палітычных зьняволеных і заяўляюць аб сваёй поўнай салідарнасьці з 10.000 палітычнымі зьняволенымі, „вымушанымі абвесьціць галодныя забастоўкі для абароны сваіх самых законных чалавечых правоў".

Польскім пралетарскім пісьменьнікам пагражае ваенна-палявы суд

Польскі фашызм налажыў сваю крывавую лапу на Польскую пралетарскую літэратуру. У Варшаве арыштавана левая група пісьменьнікаў і зачынен іх ворган часопіс «Месячник Літэрацкі», за тое, што ўзьнялі свой голас пратэсту супроць ганебнай рэчаіснасьці фашысцкіх турмаў, супроць масавага фізычнага зьнішчэньня палітзьняволеных у турмах фашысцкай Польшчы. Фашысцкая прэса вылівае патокі найаднёйшых вымудак на польскіх рэвалюцыйных пісьменьнікаў імкнучыся скампрамэтаваць іх у твары «публічнай апініі», каб замаскаваць гэты нячуваны дзікі акт клясавай помсты буржуазіі.

Шалёная падрыхтоўка да нападу на СССР, масавы зьвярыны тэрор, карныя экспэдыцыі на Заходняй Украіне, Заходняй Беларусі, прыраўнаньне палітычных вязьняў да крымінальных, зьбойства найлепшых пралетарскіх баявікоў у турмах, увядзеньне ваенна-палявых судоў і нарэшце крывавая расправа над пралетарскай літэратурай—вось сродкі за каторыя хапаюцца дзяржымоды Пільсудзкага, якія шукаюць ратунку для фашызму перад крызісам і ўсёўзрастаючым рэвалюцыйным рухам.

Арыштаваным польскім пралетарскім пісьменьнікам пагражае ваенна-палявы суд.

Рэвалюцыйныя пісьменьнікі ўсяго сьвету павінны з усёй рашучасьцю за пратэставаць супроць гэтага і мабілізаваць усе сілы пралетарыяту і працоўных каб зьнішчыць подлыя пляны польскага фашызму які імкнецца паставіць пралетарскую літэратуру перад ваенна-палявым судом.

Польскія пралетарскія пісьменьнікі БССР рашуча пратэстуючы супроць гэтага агіднага акта фашысцкага тэрору і заклікаючы да пратэсту ўсіх пралетарскіх пісьменьнікаў і ўсю савецкую грамадзкасьць абавязваюцца яшчэ з большай энэргіяй удзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве СССР і адцаць усе свае сілы і здольнасьці барацьбе за вызваленьне працоўных мас Польшчы з-пад ярма фашызму,—за савецкую Польшчу.

Польская сэкцыя БелАПП'у.

Катаваньні палітзьнявопеных у залі суда

ВАРШАВА. 15-IX. У Лёдзі закончыўся працэс вучняў і вучаніц мясцовай гімназіі, абвінавачваемых у прыналежнасьці да камсамолу. Абвінавачваемыя — ад 15 да 17 год. Два вучні прыгавораны да 5 год катаргі, астатнія—да турэмнага зьняволеньня ад 2-х да 1 году.

У Брэст-Літоўску закончыўся працэс 29 рабочых, абвінавачваемых і прыналежнасьці да кампартыі Заходняй Беларусі. 8 падсудных прыгавораны да 5 год, 4—да 4 год і 11—апраўданы.

5 год, 4,—да 4 год і 11№апраўданы.

Абвяшчэньне прыгавору падсудныя сустрэлі водгукамі: «няхай жыве рэвалюцыя. Далоў акупантаў». Паліцыя кінулася на падсудных, у залі суда адбылася дзікая сцэна зьбіваньня.

Незадаваленьне сярод салдат францускай арміі

ПАРЫЖ, 16-IX. Першая база вялікіх асеньніх манэўраў у воблясьці Эн, якая працягвалася нясупынна і ўдзень і ўвечары на працягу 72 гадзін—окончылася.

Прыбыла амэрыканская ваенная місія на чале з начальнікам генэральнага штабу амэрыканскай арміі, якая будзе прысутнічаць на манэўрах, знаходзячыся пры штабе генэрала Вэйганда.

«Юманітэ» паведамляе, што шматлікія лісты салдат, якія ня гледзячы на дакладны нагляд паліцыі, трапляюць у рэдакцыю, гавораць аб сур'ёзным незадаволеньні салдат цяжкімі недастачамі, зморанасьцю манэўраў і суровым рэжымам, якія пануюць у арміі. Салдаты адкрыта выказваюць сваё нязгавісьць да імпэрыялістычнай палітыкі.

Масавыя арышты ў Варшаве

ВАРШАВА. 17-IX. Палітычная паліцыя правяла начны вобыск у памяшканьні трох прафсаюзаў у Варшаве. Арыштавана больш 40 рабочых.

Апроч таго, праведзены масавыя вобыскі ў рабочых кварталах Варшавы. Палітычная паліцыя абвяшчае так сама, што ёю ліквідаваны «аддзел кампартыі» у складзе 27 чалавек.

ВАРШАВА, 17-IX. Забастоўка 3.000 рабочых плесераўскай мануфактуры ў Азеркове скончылася перамогай рабочых. Дырэкцыя заводу згадзілася зноў прыняць звольненую зьмену 1000 рабочых.

Данцыгскі сэнат не прадоўжыў польска данцыгскага да гавору

ВАРШАВА, 17-IX. 16-га верасьня мінуў тэрмін польска-данцыгскага дагавору аб праве стаянкі польскіх ваенных судоў у Данцыгскім порце. Данцыгскі сэнат не прадоўжыў паказанага дагавору.

У сувязі з гэтым ў Жэневе 19 верасьня Польшча патрабуе разгляду пытаньня аб прадоўжаньні дагавору.

ПАЎСТАНЬНЕ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У БАРСЭЛЁНЕ

МАДРЫД. Галадоўка палітзьняволеных якая пачалася нядаўна ў Барселёнскай турме, вылілася ўчора ў паўстаньне. Не атрымаўшы задаволеньня сваіх патрабаваньняў, палітзьняволеныя паўсталі, разброілі некалькі турэмшчыкаў і падпалілі ў некалькіх месцах турму.

Мясцовая ўлада мабілізавала значныя ўзброеныя сілы і прыдушыла паўстаньне. Улічваючы рэвалюцыйны настрой шырокіх мас працоўных, мясцовая арганізацыя анархо-сіндыкалісцкага аб'яднаньня прафсаюзаў пасьпяшыла абвесьціць аб сваёй салідарнасьці з выступленьнем палітзьняволеных і абвясьціла ўсеагульную стачку пратэсту супроць рэпрэсій з боку ўлады. У адносінах да рэвалюцыянэраў.

Верасень і кастрычнік — ударныя месяцы

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

аб ударным 2-х месячніку па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі

1. У мэтах забесьпячэньня рашаючага пералому ў справе поўнага выкананьня і перавыкананьня камплектаваньня саўгасаў і калгасных фэрм сьвінаматкамі і малочнаю жывёлаю, будаўніцтва сьвінарнікаў, скотных двароў і г. д., а таксама ў справе здачы таварнай прадукцыі і стварэньня кармавых фондаў; рашучага павароту сельпарткомаў, парт'ячэек, саўгаснага трыкутніка, праўленьняў калгасаў, сельсаветаў, земорганаў, саўгастрэстаў і ўсіх раённых партыйных, прафсаюзных камсамольскіх арганізацый ў калгасна-каапэрацыйнай сыстэме тварам да сацыялістычнай жывёлагадоўлі; для мабілізацыі шырокіх мас рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў, серадняковуй, членаў прафсаюзаў і рабселькораў на практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, верасень і кастрычнік месяцы абвясьціць ударнымі па ліквідацыі прарываў у выкананьні плянаў жывёлагадоўлі і правесьці на працягу гэтых месяцаў бадьзьвіцкі паход партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый, раённага і цэнтральнага друку, калгасных, бядняцка-серадняцкіх і рабселькораўскіх мас за поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

2. Кіраваньне паходам і распрацоўку практычнага пляну паходу ўскласьці на камісію ў складзе: Рачыцкага, Гаруновіча, Аскерка, Аўчынніка, Манжалея і прадстаўнікоў Сьвінаводкалгасцэнтру; ЦСПСБ, ЦВК і рэдакцыі газэты «Зьвязда».

3. Прапанаваць НКЗему, Калгасцэнтру, Саўгастрэстам і адпаведным саюзам камандыраваць з сваіх апаратаў у раёны максымальную колькасьць работнікаў і спэцыялістаў для дапамогі раённым арганізацыям у правядзеньні работы па рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб жывёлагадоўлі.

4. Сэктару Друку ЦК і рэдакцыям цэнтральных газэт і часопісаў арганізаваць шырокае асьвятленьне ў друку работы ўсіх арганізацый асобных калгасаў і саўгасаў па выкананьні здвоэнага ЦК УсеКП(б) і пастановы ЦК КП(б)Б аб жывёлагадоўлі, а таксама арганізаваць рабселькораўскія брыгады, пасты і выезды рэдакцый ў раёны для праверкі работы і дапамогі раённым арганізацыям па выкананьні пляну разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

За цёплы кароўнік і сьвінарнік, за магутную кармавую базу, за высокую таварнасьць

Нарада жывёлагадоўчых раёнаў

Гэтымі днямі пры НКЗ адбылася нарада сакратароў Райкомаў КП(б)Б, загадчыкаў Райзаў і загадчыкаў Райфаў і старшынь Райкалгассаюзу 36 жывёлагадоўчых раёнаў БССР.

З вялікім дакладам аб разьвіцьці жывёлагадоўлі выступіў Нарком земляробства тав. **РАЧЫЦКІ.**

Вуздавым пытаньнем сёньняшняга дня,—адзначыў дакладчык,—зьяўляецца захаваньне маладняка, камплектаваньне стада, спыненьне страты ў жывёлагадоўлі, стварэньне кармавой базы, скančэньне будаўніцтва, барацьба за высокую таварнасьць жывёлагадоўчых і сьвінагадоўчых гаспадарак.

Трэба адзначыць, што ў галіне жывёлагадоўлі мы маем значныя прарывы. Плян камплектаваньня сьвінагадоўчых саўгасаў сьвінаматкамі выкананы на 43,5 проц. калгасных фэрм—43,6 проц. камплектаваньне жывёлагадоўчых саўгасаў—каровамі выкананы на 48 проц., калгасных фэрм на 74 проц. Зусім дрэнна праводзіцца будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў. Плян па будаўніцтву ледзь выкананы на ½ заданьня.

Здача таварнай прадукцыі зрываецца. Плян па здачы малочнай прадукцыі саўгасамі выкананы на 9,5 проц., калгасамі на 45 проц. Заданьні па здачы мясной прадукцыі па лініі Сьвінаводцэнтру выкананы ледзь на 2,1 проц.

Трэба дабіцца рашучага пералому ў правядзеньні будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў. Мясцовыя арганізацыі мала цікавяцца гэтым пытаньнем. На мясцох не выкарыстоўваецца салома, чарот, як добры матар'ял на пабудову стрэхаў, не выкарыстоўваюцца жэрдкі на пбудову столяў у аборах і г. д.

Трэба дабіцца рашучага пералому ў даглядзе за жывёлай. Нельга мірыцца з такім становішчам, калі карова дае 2-2 з паловай літры малака.

Зусім не разгарнулася кампанія за стварэньне моцнай кармавой базы. Сіласаваньне кармоў праводзіцца дрэнна. Плян па сіласаваньні выкананн на 12 проц., касьба атавы другога ўкосу зусім не разгарнулася. Нічога ня робіцца, каб прыступіць да сіласаваньня бульбяніка, ня гледзячы на тое, што ён пачынае чарнець.

Вялікая ўвага павінна быць зьверну та на ўборку кораньплодаў, у прыват насьці бульбы. Павінна быць мабілізавана ўвага ўсіх арганізацый на своячасовае і ўважлівае правядзеньне ўборкі бульбы. **Наш лёзунг—не пакінуць у зямлі ніводнай бульбіны.**

Нарада заслухала садаклады з месц. **Касьцюковіцкі раён** (тав. Грышанаў). Замест 11 малочных фэрмаў, арганізавана 22. МТФ укамплектаваны 111 пр., сьвінагадоўчыя фэрмы ўкамплектаваны на 62 проц., сьвінагадоўчы саўгас—на 101 проц.

Здача таварнай прадукцыі па малаку выкананa на 62 проц., па сьвіньнях на 21 проц.

Плян сіласаваньня па МТФ выкананн на 32 проц., наогул па раёне на 12,5 проц.

Пляны будаўніцтва па фэрмах выкананы на 72 проц.

Кармянскі раён (Розін). Камплектаваньне МТФ выкананa на 43,7 проц., СТФ—на 42,7 проц. Агульны плян будаўніцтва выкананн на 37,2 проц. Плян здачы таварнай прадукцыі выкананн на 3,6 проц.

Вэтабслугоўваньне ў раёне дрэннае. Укараненьне вэтзоомінімума парводзіцца слаба.

Сіласаваньне кармоў па раёне выкананa на 13,5 проц.

Слуцкі раён (Соскін). Камплектаваньне МТФ выкананa на 143 проц., СТФ на 55,1 проц., цялятныя фэрмы ўкамплектаваны на 32 проц. Плян здачы малочнай прадукцыі па МТФ выкананн на 68 проц., па СТФ на 7,5 проц. Сіласаваньне кармоў па калгасах праведзена на 55,5 проц.

Будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў разгортваецца марудна. Агульны плян будаўніцтва выкананн на 55 проц.

Чырвонапольскі раён (Юркін). Плян камплектаваньня СТФ выкананн на 43 проц., МТФ—на 95,27 проц. Сіласаваньне кармоў праведзена на 24 проц.

Копыльскі раён (Райкоўскі). Камплектаваньне па МТФ—74,7 проц., па СТФ—20,6 проц., па цялятніках—46,2 проц., СТФ выканалі плян па здачы таварнай прадукцыі на 1 проц., МТФ —123 проц. Сіласаваньне кармоў выкананa на 9,5 проц.

Барысаўскі раён (Скакун). **Барысаўскі раён уключыўся ва ўсебеларускі конкурс на лепшую сьвінагадоўчую і малочную фэрму.**

Камплектаваньне МТФ выкананa на 62 проц., здача таварнай прадукцыі на 42 проц. Камплектаваньне СТФ—28,5 проц., здача таварнай прадукцыі 6,6 проц.

Сіласаваньне кармоў праведзена на 20.2 проц.

Тав. Скакун дае абяцаньне, што да пачатку зімы пляны будаўніцтва будуць выкананы.

Паставіць сьвіньню пад дах

У тэрмін скончыць будаўніцтва СТФ

На Аршаншчыне ў гэтым годзе арганізавалася 5 калгасных сьвінагадоўчых таварных фэрм. Па пляну ў гэтых фэрмах павінна быць пастаўлена 200 сьвінаматак і на гэта стада павінны быць пабудаваны сьвінарнікі.

На сёньняшні дзень гэты плян ня выкананы. Сьвінаматак пастаўлена 447, а будаўніцтва сьвінарнікаў яшчэ ня скончана.

У калгасе «Х Кастрычнік» будаўніцтва сьвінарніка праходзіць вельмі марудна. Будаваць яго пачалі яшчэ летась, а калі скончаць, не ведома. Кіраўніцтва калгаса не паклапацілася нарыхтаваць патрэбныя будаўнічыя матар'ялы, дзякуючы гэтаму зараз зрываецца пабудова сьвінарнікаў, ня гледзячы на тое, што рабочай сілы хапае і ёсьць сродкі.

У калгасе «Ленінскі Шлях», Бразьдзечынскага сельсавету, сьвінарнік не будуецца, бо своячасова не загатовілі патрэбных будаўнічых матар'ялаў.

У калгасе «Прамень асьвятленьня» фэрма разьлічана на 100 сьвінаматак. Пабудову сьвінарніка пачалі, ёсьць і будаўнічыя матар'ялы, але грошы, ад пушчаныя на пабудову сьвінарніка, патрацілі на іншыя патрэбы. Зараз няма магчымасьці наняць рабочых для скančэньня сьвінарніка.

Такое становішча ў дальнейшым ні ў якім разе недапушчальна. Зараз, калі партыя падышла пачыняна да вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы, ўся ўвага раённай партыйнай арганізацыі, а таксама і калгаснай сыстэмы павінна быць накіравана на будаўніцтва сьвінарнікаў, на ўкамплектаваньне фэрм і здачу імі таварнай прадукцыі.

Калюжны.

Не разбазарваць будаўнічых матар'ялаў

Бягомля (ад наш. спэц. кор.). Будаўніцтва сьвінарнікаў у саўгасе «Камінтэрн» ідзе надзвычайна марудным тэмпамі.

Плян па будаўніцтву выкананн ня больш, як на 45 проц.

Унутраное абсталяваньне сьвінарнікаў зроблена на тандэт. Загарадкі былі паломаны ў першы дзень прыбыцьця туды сьвіней.

Шмат будаўнічага матар'ялу, дзякуючы нядбайным адносінам дзесятнікаў (Быкаў, Калмык і інш.), пайшла на дровы.

Трэба палажыць канец гэтым злачынствам. Трэба ўзьняць тэмпы і якасьць працы на будаўніцтве сьвінарнікаў у саўгасе «Камінтэрн».

Макарэвіч.

Змагайцеся за якасьць будаўніцтва

15.000 руб. выкінуты на вецер

У саўгасе **Несяты** (Клічаўскі раён) у мінулым годзе былі пабудаваны 5 сьвінарнікаў. На будаўніцтва сьвінарнікаў было затрачана 15.000 руб.

Ня гледзячы на тое, што сьвінарнікі нядбайна пабудаваны, яны прышлі ўжо ў поўную негодную. Прарабы **Кандакоў, Каган і Плоткін** нядбайна адносіліся да будаўніцтва. Сьцены ў сьвінарніку развальваюцца: косяцца, у некаторых мясцох зьявіліся вялікія дзюркі; катухі для сьвіней зусім разваліліся, вэнтыляцыя бязьдзейнічае і г. д.

Зараз прыступлена да капітальнага рамонту разбураных сьвінарнікаў, на што патрабуецца ня менш 10.000 руб., але і рамонт іх ня лепшай якасьці, як і будаўніцтва. Прараб Гусеў дапусьціў да працы ў якасьці дзесятніка заўзятага п'яніцу **А. Гушчу**, які некалькі разоў прыцягваўся да судовай адказнасьці па розных справах. Гушча рамонтам сьвінарнікаў не цікавіцца, справы ня ведае. У выніку гэтага яшчэ 10.000 рублёў будзе выкінута на вецер.

РайРСІ і райпракуратура павінна зацікавіцца гэтым пытаньнем. **Сачыўка.**

Месячнік прайшоў, а вынікаў няма

Правядзеньне месячніка беларусізацыі па Барысаўскім раёне не дало належнага штуршка для далейшай работы па ажыцьцяўленьні беларусізацыі. Вакол месячніка ня была мабілізавана шырокая савецкая грамадзкасьць. Да гэтага часу нават не падагулены вынікі месячніка.

Праверка раду прадпрыемстваў і ўстаноў паказала, што ў справе нацпалітыкі на Барысаўшчыне маецца вялікі прарыў. На такім прадпрыемстве як «Домбаль», дзе налічваецца больш 1000 чалавек рабочых, канцылярыя, бухгальтэрыя, разьліковы стол, пляна вы аддзел і ўсе іншыя аддзелы працуюць выключна на расійскай мове. Вось такія ўстановы як райсампрамсаюз, райкалгассаюз, райкаапсаюз справаводзтва вядуць на беларускай мове, а абслугоўваньне наведвальнікаў на расійскай мове. Як агульнае зьвішча—наведвальнікаў установ не абслугоўваюць на мовах нацменшасьцяй.

Па ўсіх прадпрыемствах і установах інтэрнацыянальнае выхаваньне амаль не праводзіцца. Ні партыйныя, ні прафсаюзныя арганізацыі гэтай справай ня цікавяцца. На зав. «Домбаль» літаратурнага складу літаратуры на мовах нацменшасьцяй няма. Толькі нядаўна закуплена літаратурна на мовах нацменшасьцяй на 300 руб. Зусім ня выпісваюцца газэты на польскай і яўрэйскай мове.

У насьцянгазэце нельга знайсьці хоць-бы адну заметку на мовах нацменшасьцяй (райкалгассаюз, райпрамсаюз і інш. установы).

Усё гэта, разам узятае, стварае спрыяючыя ўмовы для разьвіцьця антысэмітызму і шавінізму рознага колеру. Прывядзем некалькі фактаў. Як у апараце, так і па сыстэме райсампрамсаюзу ёсьць праявы яўрэйскага шавінізму. Працаўнік райсампрамсаюзу Герчыкаў прытрымліваецца думкі, што: «На алказных пасадах трэба вылучаць толькі яўрэяў, бо яны больш здольныя».

Служачымі заводу імя Домбаля ігнаруецца белмова. Па адрасу белмовы кідаюцца ігранічныя насьмешкі. Працаўнік Аўласаў ня хоча ўжываць белмову таму, што ён думае выехаць у Маскву. Загадчык бухгальтэрыі заявіў, «што справы будуць весьціся на расійскай мове, ня гледзячы на тое, што я добра ведаю белмову».

Калі камісія па праверцы беларусізацыі гэтым выпадкам дала ацэнку, як праяўленьню вялікадзяржаўнага шавінізму, дык парткалектыў заводу не згадзіўся з гэтым. Парткалектыў такім чынам стаў у абарону тых, хто сьвядома не жадае ажыцьцяўляць нацпалітыку.

Разам з пасыўным супрацьўленьнем беларусізацыі, маюцца выпадкі рашучага нежаданьня вывучаць і карыстацца белмовай. Тэхнік будаўнічай канторы райкалгассаюзу Мельнічэнка кажа: «Я—украінец і беларускай мовы вывучаць не жадаю; усё роўна ўсіх моў ведаць ня будзеш, усе разумеюць расійскую мову,—я на ёй і гавару. Вывучаць беларускую мову патрэбен час, ды навошта зморваць сябе, усё роўна я з Беларусі праз паўтара гады паеду».

Ці ёсьць з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый якое небудзь рэагаваньне? Трэба сказаць, што не.

Райпрафсавет, у першую чаргу райком партыі павінны заняцца ажыцьцяўленьнем нацпалітыкі не кампанейскім мэтадам, а весьці гэтую работу сыстэматычна. Пара ўжо зразумець, што барацьба за ленінскую нацпалітыку, ёсьць барацьба за генэральную лінію партыі.

Я. Пялінскі.

Не кампанейскі, а сыстэматычна

весьці работу па беларусізацыі партыйнага, дзяржаўнага і гаспадарчага апарату

Неразуменьне нацпалітыкі, ці праява вялікадзяржаўнага шавінізму?

У глухім кутку Бабруйшчыны, у Глускім раёне, ад 4-га верасьня г. г. працавала на лесазагатоўках брыгада студэнтаў літфаку вышэйшага пэдінстытуту.

Як і трэба было чакаць, студэнты не абмежаваліся выпрацоўкай сваёй «нормы» толькі ў лесе, а ўзяліся і за палітыка-выхаваўчую работу ў тэй вёсцы, дзе яны застанавіліся.

6-га ці 7-га верасьня ў вёсцы Нязнань (18 двароў, вёска надзвычайна адсталая, — 1-2 пісьменных чалавекі на ўсю вёску), праводзіўся сход моладзі па пытаньні арганізацыі камсамольскай ячэйкі.

І дакладчык, і асабліва прамоўцы (з ліку кіраўніцтва брыгады) чамусьці палічылі патрэбным на гэтым сходзе гаварыць выключна па-расійску, ужываючы да таго-ж, такія вельмі «зразумелыя» і «шыбка-граматныя» слоўцы як «консервативная», «перспектива», «ситуация» і г. д.

Па-беларуску гучэла толькі адно слова: «калгас».

Брыгадзіры-менапаўцы, якія працавалі там-жа, па лініі пэдінстытуту, зьмясьцілі ў насьценнай газэце «Студэнт на лесазагатоўках» допіс пра шавіністычны выбрык тав. Кнышова і іншых таварышоў, якія выступалі на сходзе, ігнаруючы беларускую мову. Але допіс не дапамог. Праз некалькі дзён у той-жа вёсцы на сходзе прысьвечаным калектывізацыі, дакладчык тав. Позьнік — «бла ополучно» і нязрыкметна для самога сябе перайшоў на «общепонятную» мову...

Варта дадаць, што ў рэдкалегіі насьценгазэты была тэндэнцыя змазаць гэтую справу і толькі, дзякуючы тэхнічнаму недагляду, допіс менапаўцаў трапіў па прызначэньні без камэнтараў «ад рэдакцыі».

Мы разглядаем паводзіны кіраўніцтва брыгады (т. т. Радзюк, Дубінец), якое патурала пагардлівым адносінам да беларускае мовы пасобных таварышоў, як простае і адкрытае парушэньне важнейшых дырэктыў партыі ў галіне беларусізацыі.

Мы лічым недапушчальным зьявішчам упартае супрацьўленьне беларусізацыі з боку студэнтаў беларускай ВНУ. Такім студэнтам ня месца ў сьценах Вышэйшага пэдінстытуту, які рыхтуе работнікаў для абслугоўваньня іменна беларускага працоўнага насельніцтва.

Партарганізацыі і прафком пэдінстытуту павінны зацікавіцца гэтай справай.

Брыгада друку **Юр. Лявонны. С. Шушкевіч.**

Выжыць антысэмітаў з калгасу

У калгасе імя «16 партызан» Сьмілавіцкага раёну маецца 5-7 сельсаветаў яўрэйскага насельніцтва. Праца сярод гэтых калгасьнікаў яўрэяў і беларусоў выхаваўчага зьместу, а таксама і культмасавага адсутнічае. За 2-х гадовае існаваньне калгасу, ня было зроблена ніводнага дакладу па пытаньні інтэрнацыянальнага выхаваньня. І гэта ў той час калі ў калгасе маюцца культурныя сілы, з якімі можна шмат чаго зрабіць.

Ці ўсё добра абстаіць з нацыянальнай палітыкай ў калгасе? Не ня ўсё добра. Сыстэматычна наглядаюцца больш заможнай часткай калгасьнікаў беларусоў на калгасьнікаў яўрэяў. Ёсьць выпадкі, калі калгасьнікі беларусы адмаўляюцца разам працаваць з калгасьнікамі яўрэямі. У калгасе ўста навілася такая традыцыя, паводле якой ва ўдарныя брыгады калгасьнікі яўрэі ня ўключаюцца. 2 ліпеня г. г. калгасьніца яўрэйка Ідальчык Хана прышла працаваць на канюшыну. Брыгада калгасьніц Куліна, Бандарчык Фоня, Шпак Хэўра замест таго, каб дзяўчыняе дзе сябе ў брыгаду вакол яе паднялі сьмех і крык, пачалі абзываць дрэннымі словамі. Ідальчык працавала 2 дні адна, а потым з плачам вымушана была пакінуць зусім працу. Асобліва «заэкстывізавалася» антысэмітка Крэпская, якая калгасьніц-яўрэек сыстэматычна цкуе і над імі зьдзекваецца.

Гэтыя факты здарыліся ня стыхійна. У гэтым напрамку і да сучаснага моманту ялася шкодніцкая праца зарваўшагася заможнага элемэнту, які ў калгасе зьвіў моцнае гняздо.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што мясцовыя арганізацыі, Лукорскія партыйная і камсамольская ячэйкі прыпусцілі сваю клясавую пільнасьць, не зьвяртаюць увагі на мабілізацыю мас на рашучае ажыцьцяўленьне нацпалітыкі.

Партыйная ячэйка па апартуністычнаму аднеслася да ўсіх гэтых фактаў.

РК КП(б)Б і РКК РСІ трэба ў гэрмінovым парадку ўсё высьвятліць і дзяць рашучы адпор зарваўшымся антысэмітам, якія ставяць сваёй мэтай разваліць калгас.

Ударнік.

Канчаткова ліквідаваць недахопы

ў справе ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі

Месячнік генэральнай праверкі беларусізацыі па Любаньскім раёне паказаў, што партыйныя, камсамольскія, савецкія, прафсаюзныя, каапэрацыйныя і гаспадарчыя арганізацыі ў асноўным правільна зразумелі Ленінскую нацпалітыку, практычна ажыцьцяўляюць гэткую. У справе ажыцьцяўленьня нацпалітыкі ёсьць значныя дасягненьні, якасьнымі паказьнікамі якіх зьяўляюцца:

Акрамя пачатковых школ маюцца 4 сямігодкі, з іх адна яўрэйская. Усеагульным навучаньнем ахоплена прыблізна на 98 проц. дзяцей школьнага ўзросту, разгорнута ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослага насельніцтва, існуюць хаты чытальні і чырвоныя куткі. Працуе вячэрні рабфак, праводзілася праца сярод працоўнага насельніцтва нацменшасьцяй ў напрамку ўцягненьня яго ў сацбудаўніцтва і г.д. Але побач з дасягненьнямі ёсьць значныя недахопы. Месячнік выявіў палітнапісьменнасьць значнай колькасьці працаўнікоў, амаль поўнае неразуменьне нацпалітыкі і тых ухілаў, якія маюцца ў вырашэньні гэтага пытаньня. Да ліку такіх працаўнікоў адносяцца некаторыя працаўнікі пошты, райдзяржбанку, каапсаюзу, дарбуду і інш. Гэтыя таварышы тлумачаць сваю палітычную няпісьменнасьць «перагрузкай», адсутнасьцю часу чытаць газэты і г. д. Партарганізацыя Любаньшчыны павінна неадкладна ўзмацніць кіраўніцтва партпрафвучобай.

Праца па інтэрнацыянальным выхаваньні сярод насельніцтва праводзілася слаба, у выніку чаго мы маем праявы антысэмітызму і шавінізму. У сэнсе аўладаньня беларускай мовай ў штодзённым жыцьці, пераводу канцылярскай справы на апошнюю маюцца зрухі, але ёсьць і прарывы. Так кантора саўгасу, дарбуд, пошта палкам яшчэ не перайшлі на белмову. На пытаньне нашу ў вас марудна адбываецца пераход на белмову? Некаторыя працаўнікі, у прыватнасьці пошты спасылаюцца на тое, што яны маюць больш перапіскі з РСФСР. Загадчыкі ўстаноў пошты і дарбуду Гарэльчык і Воўкаў мала таго, што ніякай працы не праводзяць сярод свайго калектыву, але і самі беларускай мовы ня ведаюць. На чальнік дыстанцыі т. Воўкаў гаворыць выключна на расійскай мове. На праверку чамусьці не зьявіўся.

Некаторымі працаўнікамі беларуская мова ўжываецца кампанейскі толькі таму, каб ня прыпісалі вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму (Рукасуева, Палыкоўская і працаўнікі дарбуду).

Цікава адзначыць, што статыстык райсаюзу тав. Палыкоўская, якая толькі ў гэтым годзе скончыла Віцебскі каапэрацыйны тэхнікум, беларускай мовы зусім не жадае ўжываць. Фэльчар Яменскага сельсавету на запытаньне: чаму ў вас запіс вядзецца на расійскай мове? адказвае:—«Я написал по русски фамилию потому, что здесь очень малое место».

Паданыя факты сьведчаць аб наяўнасьці вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, барацьба з якім, павінна весьціся, як з галоўнай небясьпекай на даным этапе.

Недастаткова абслугоўваецца працоўнае насельніцтва нацменшасьцяй. Напрыклад, у местачковым савеце, дзе яўрэйскае насельніцтва, складае значны процант, няма тэхнічнага працаўніка ў савеце, які ўладаў - бы яўрэйскай мовай. Нават раённая бібліятэка зусім мала мае беларускай літаратуры. Маюцца кнігі, якім ня месца там.

К. Х.

5 штурмавых пасеўных дзён

Усе сілы, усе сродкі на забесьпячэньне поўнага выкананьня пляну асеньняй сяўбы да 23 верасьня

Вучыцеся ад Чырвонай Слабады ўдарна працаваць і перамагаць

Тэмпы сяўбы нарастаюць слаба

Па-бальшавіцку змагацца за застаўшыяся 47,8 проц.

Асеньняя сяўба па калгасах, саўгасах і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках праходзіць нездавальняюча. Агульны плян БССР па засеве азімага ніліну на 15 верасьня выкананы толькі на 52,2 проц.

Апошняя пяціднёўка не дала адпаведнага руху ў пасьняховым разгортваньні асеньняй сяўбы.

Калі, напрыклад, на 10 верасьня агульны плян па сяўбе быў выкананы на 38,3 проц., дык за апошнюю пяціднёўку, г. зн. на 15 верасьня выкананьне пляну ўзрасло толькі на 13,9 проц.

Асабліва адстаюць па правядзеньні сяўбы раёны: Любаньскі, які выканаў агульны плян толькі на 5,6 проц., Тураўскі—на 0,8 проц., Старадароскі—5,9 проц.

Калі-ж будзеце сеяць?

У Бігосаўскім сельсавеце, Дрысенскага раёну, сяўба азіміны зрываецца.

Некаторыя сельсаветы на 10-га верасьня яшчэ не прыступілі да сяўбы. Кіраўніцтва з боку сельсавету калгасамі адсутнічае. Рад калгасаў яшчэ не прыступіў да зяблевага ворыва.

Асноўнае, што зрывае правядзеньне сяўбы і зяблевага ворыва—гэта недастатковая арагнізацыя працы ў калгасах. Зьдзельшчына ў большасьці ня ўведзена: Ураўніўка моцна ўкаранілася ў асноўных галінах гаспадаркі. Неабходна самым рашучым чынам ліквідаваць гэты прарыў.

МТС—у першых радох

Зводка аб ходзе сяўбы на 15-га верасьня сьведчыць, што МТС Беларусі за апошнюю пяціднёвку значна падвысілі тэмпы работы па скančэньні азімай сяўбы.

Рад МТС ужо выканалі свае пасеўныя пляны са значным перавыкананьнем, а астатнія МТС канчаюць сяўбу.

Лепельская, Мсьціслаўская, Касьцюковіцкая, Аршанская, Клімавіцкая, Горацкая, Койданаўская, Лёзьненская, Вушацкая, Дубровенская МТС па сяўбе ідуць наперадзе. Толькі Рагачоўская, Жыткавіцкая, Стара-Дароская МТС злачынна плятуцца ў хвасьце.

Чырвоная Слабада скончыла асеньнюю сяўбу

Перамогі перадавых калгасаў выклікалі новы калгасны прыліў

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. (Белта). На 10-га верасьня ў раёне скончана асеньняя сяўба. Ударныя прыклады работы па разгортваньні сяўбы паказалі калгасы: імя Сталіна, «Пуцілавец», «Іскра Ільліча», «МОПР», «Чырвоны куток» і саўгас Рачкавічы, якія датэрмінова скончылі азімую сяўбу.

Дзякуючы добрай разгорнутай работе, у калгас «Бальшавік» за 1 дзень уступіла 6 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадаран.

„Лявацкая" недаацэнка

арганізацыі сяўбы ў аднаасобным сэктары

СЛУЦАК. (Наш кар.). Згодна пастановы ўраду і партыі, асеньняя сяўба ў раёне павінна быць скончана да 10-га верасьня.

Але. Случчына на сёньняшні дзень выканала плян па сяўбе ня больш як на 50 проц.

Некаторыя калгасы і сельсаветы яшчэ не пачыналі сяўбы. Напрыклад, Стараўскі сельсавет не зварочвае ўвагі на своячасовае скančэньне сяўбы. Калгасы гэтага сельсавету да сяўбы не прыступілі.

Яшчэ горш праходзіць сяўба па аднаасобным бядняцка-серадняцкім сэктары, ва якіх сельсаветы не зьвярнулі ніякай увагі.

Пашырэньне плошчы па аднаасобным сэктары зрываецца.

Старшыня райза тав. Кахановіч лічыць, што «большасьць насельніцтва ў калгасах, таму аднаасобны сэктар не патрабуе такой увагі як раней».

Райкалгассаюз займецца папяровай пісанінай, а як выконваюцца пляны асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва не правяраце.

Такое становішча павінна быць ліквідавана. **Курдо.**

Ня ставіць у „чаргу"

асеньнюю сяўбу і зяб

Вушацкі раён па зяблевым ворыве адстаў ад усіх іншых раёнаў. На сёньняшні дзень 15 сельсаветаў гэтага раёну яшчэ зусім не прыступілі да зяблевага ворыва, а ў тых сельсаветах, якія ўжо пачалі ворыва на зяб, работа пасоўваецца вельмі марудна.

Напрыклад, самы перадавы Масырскі сельсавет на 11 верасьня нават ня ўзараў і 60 га. Сарачынскі—узараў толькі—37 га і Завячэльскі—4 га.

Раённыя партыі і ўраду аб тым, каб на зяблевае ворыва перакінуць значную частку цягавай сілы, у Вушацкім раёне ня выконваюцца. Пляны не даведзены да шырокіх мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў, і на пасьняховае выкананьне гэтай баявой задачы не мабілізована грамадзкасьць раёну.

У некаторых сельсаветах разважаюць: «з зябам яшчэ здолеем справіцца». Гэтым разважаньням ня дадзена рашучага адпору і тым самым дапушчаныя памылкі ня толькі не выпраўляюцца, а паглыбляюцца.

Раённым партыйным і савецкім арганізацыям патрэбна зьвярнуць асаблівую ўвагу на заканчэньне зяблевага ворыва. **Кароль Кастусь.**

Растуць рады пераможцаў

Перадавыя калгасы паказваюць узоры барацьбы за пасеўныя пляны

ВУШАЧЫ. (Наш кар.) Перадавыя калгасы Вушацкага раёну па бальшавіцку здолелі ўвязаць скančэньне ўборачнай кампаніі з правядзеньнем асеньняй сяўбы.

Так, напрыклад, да 10 верасьня скончылі сяўбу азімых калгасы: «Наша Сіла» на плошчы 45 га; «Новы мір»—на плошчы 44 га, «Пралетары, Гарбаціцкага с-савету, на плошчы 139 га, «Чырвоны Усход»—на плошчы 230 га, калгасы «Сакко і Ванцэці», «Молат», «Бальшавік», «Зьвязда» і іншыя.

Гэтых посьпехаў калгасы дасягнулі на аснове правільнай расстаноўкі сіл і арганізацыі працы.

Юрка Росны.

Трактары—на поўны ход

БЯГОМЛЬ. (Наш спэцкар.). У саўгасе Мсьціскага сельсавету «Камінтэрн» трактарная калёна працуе зусім дрэнна. Нормы выпрацоўкі выконваюцца ня больш як на 80 проц. Якасьць работы—надзвычай дрэнная.

Нездавальняючыя адносіны назіраюцца таксама да выдаткаваньня гаручага. Старэйшы трактарысты Восіпаў сочыць за работай трактарнай калёны.

Трэба безадкладна пусьціць на поўны ход трактарную калёну, дамагаючыся перавыкананьня норм выпрацоўкі і здавальняючай якасьці работы на працягу кампаніі па зяблевым ворыве і асеньняй сяўбе.

Макарэвіч.

Ганебны баланс

ЖЛОБІН. (Белта). Асеньняя сяўба па Жлобінскім раёне праходзіць надзвычайна марудна. На 15-га верасьня плян выкананы ня больш як на 15 проц. Рад сельсаветаў да сяўбы яшчэ не прыступіў: (Стара-Рудзянскі, Казьміраўскі, Н.-Маркаўскі).

Сельска-гаспадарчыя сэкцыі пры сельсаветах нічога ня робяць у напрамку кіраўніцтва работай па правядзеньні сяўбы.

Аб зяблевым ворыве і ўзьняцьці цаліны ў раёне зусім мала дбаюць. Большасьць калгасаў яшчэ не прыступіла да зяблевага ворыва.

Камсамол Ельску з гонарам выконвае заданьне

Ельскі раён атрымаў заданьне паслаць 125 рабочых для Данбасу.

Адбыўшыся пленум РК КСМ з усёй сур'ёзнасьцю і палітычнай адказнасьцю ўзяў на сябе з агульнага заданьня раёну 125 чал. мабілізаваць 30 камсамольцаў для Данбасу.

Вынікі адпраўкі першай партыі наступныя.

На 10 верасьня патрэбна было адправіць 30 проц. заданьня, адпраўлена каля 40 проц., у тым ліку 13 камсамольцаў, на 13 верасьня ўжо адпраўлена на Данбас больш 60 проц. агульнага заданьня ў тым ліку 25 камсамольцаў.

У раёне складзена камісія садзейнічаньня па вярбоўцы і адпраўцы на Данбас. Уся гэта работа праходзіць пад непасрэдным кіраўніцтвам РК КП(б)Б і ўдзелу грамадзкіх арганізацый. З боку РК КСМ вылучаны два адказныя працаўнікі ў дапамогу вярбоўшчыкам Данбасу.

Ход усёй працы паказвае, што дадзенае заданьне 125 у тым ліку 30 КСМ будзе выканана.

Б.

Пастанова

сакратарыяту Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б ад 18-IX—31 г.

1. Абвясьціць з 20-га верасьня па 10-е кастрычніка 2-х дэкаднік масавай праверкі выкананьня задач, пастаўленых прамовай тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў.

2. 2-х дэкаднік правесьці пад кутом погляду выкананьня наступных задач: ліквідацыя адставаньня ў выкананьні колькасных і якасных паказчыкаў у выкананьні прамфінпляну, праламленьне новых форм сацспаборніцтва і ўдарніцтва (гаспадарча-разьліковыя брыгады, зьменна-сустрэчныя пляны), арганізацыя масавага збору рабочых прапаноў па рэалізацыі пастаўленых тав. Сталіным задач.

3. Праверку правесьці шляхам арганізацыі самаправераючых брыгад, вылучаемых на рабочых сходах.

4. Прымацаваць на час 2-х дэкадніка да прадпрыемстваў адказных работнікаў Гаркому, абавязаўшы іх прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні 2-х дэкадніка.

МАНЭУРЫ Р. С. Ч. А. ПАЧАЛІСЯ

Актыўнай дапамогай і ўдзелам у манэўрах працоўныя Беларусі дакажуць сваю цесную і непарыўную сувязь з Чырвонай арміяй, сваю непахісную волю да выкананьня плянаў сацыялістычнага будаўніцтва, да абароны заваёў Кастрычніка

УЗМАЦНЯЙ ТЫЛ--

стварай магутную базу Чырвонай армії---вартаўніка Саюзу ССР

Баявы ход падрыхтоўкі да манэўраў СПА

Друкарня імя Сталіна

Друкары-сталінцы падрыхтоўчы перыяд да манэўраў разгарнулі па баявому. Перад пачаткам работы вышаў спэцыяльны нумар шматтыражкі **«Друкарская праўда»** прысьвечаны манэўрам. Нумар газэты выдадзен сумесна з рэдкалегіяй падшэфнай часткі, і ў ім адбіты ўсе бакі работы падрыхтоўчага пэрыяду.

Надаючы вялізарнае значэньне манэўрам СПА **друкарня імя Сталіна адначасова рыхтуецца да вытворчых манэўраў** на прадпрыемстве. Згодна пастановы бюро парткалектыву, вытворчыя манэўры на прадпрыемстве вызначана правясьці з 20 верасьня, тэрмінам у 12 дзён. Для кіраўніцтва вытворчымі манэўрамі абран штаб.

Работа штабу ідзе напружана. Вызначаны кіруючыя групы па цэхах. Абазначаны рабкораўскія пасты. Шматтыражка **«Друкарская праўда»** будзе выходзіць праз дзень.

Па лініі камсамольскай складаюцца пасты. Апэрацыйная работа ўсіх зьвеньняў пастаўлена чотка.

Па цэхах праводзяцца зьлёты рабкораў для прыняцьця агульнага ўдзелу рабкораў у апэрацыйнай рабоце ў часе ходу манэўраў.

Бюро парткалектыву выдала адозву да ўсіх рабочых і служачых з закліканм да напружаных тэмпаў у часе манэўраў.

Бюро парткалектыву, ФЗ і абраны штаб, пры ўдзеле ўсёй грамадзкасьці друкарні мабілізуюцца на выкананьне пунктаў сацумовы, заключанай з падшэфнай часткай. Вышаўшы нумар **«Друкарскай праўды»** заклікае рабочых друкарні на перавыкананьне прамфінпляну, каб у дні манэўраў працаваць напружана і, вышаўшы пасьля хова на фронце барацьбы за прамфінплян, сустракаць падшэфнікаў і ўсю Чырвоную армію з манэўраў, маючы на сваіх сьцягах паказчыкі 100 проц. выкананьня сацумовы і вытворчых заданьняў.

Супроцьпаветраная абарона ў друкарні разгорнута.

Друкарня падрыхтавана да працы ў ваенны час і да супроцьпаветранай абароны. Складзены з камсамольцаў атрад СПА, у якім ідуць нармальна заняткі. Начсклад запасу прыцягнуты да працы.

Праверка падрыхтоўкі да манэўраў прайшла ў друкарні задавальняюча. Сваячасовасьць яўкі атрадаў дала магчымасьць штабу хутка прыняць захады па «абароне» друкарні.

Як недахоп трэба адзначыць недастатковасьць дысцыпліны ў атрадзе імя Варашылава. Камсклад атраду рашучых захадаў да ўзьняцьця дысцыпліны ня прымае, а спадзяецца на штаб, а з боку штабу няма рэагаваньня.

Бюро парткалектыву рэагавала на паасобныя выпадкі. Шматтыражка на сваіх старонках бічуе за падрыў дысцыпліны.

Уступаючы ў вытворчыя манэўры, друкары Сталіна пераключаюцца на сапраўдныя баявыя тэмпы. У гэтыя дні гул машын павінен быць незамоўкны. Усе на свае месцы. Ніводнай хвіліны прастою. Ніводнага прагулу і спазьненьня. За тэхнічны прастой—будзе адказваць вінаваты гаспадарнік, інструктар, майстар — так паставіла задачу шматтыражка **«Друкарская праўда».**

Пакрыць прарыў, падрыхтавацца да 4 кварталу, даць найвышэйшыя паказчыкі ў працы—баявая задача ў дні манэўраў. З гэтай задачай друкары-сталінцы, пад кіраўніцтвам парткалектыву, справяцца.

Шэмпель.

Мы абвяшчаем сябе ўдарнай пабудовай імя абароны

Ліст рабочых пабудовы Дзяржбібліятэкі да падшэфнага палка

ТАВАРЫШЫ ЧЫРВОНААРМЕЙЦЫ!

У той час калі вы пасьля гадавой вучобы праводзячы манэўры будзеце трымаць палітычны баявы экзамін,—**мы рабочыя пабудовы Дзяржбібліятэкі** (120 чал.), наглядаючы за капіталістычным сьветам, за іх бразганьнем зброяй у наш бок, разам з усімі працоўнымі Савецкага Саюзу **стаім на варце.**

Мы праз нашы грамадзкія арганізацыі Асаавіяхім і Аўтадор рыхтуем наш рабочы калектыў да абароназдольнасьці, ахапіўшы 50 проц. рабочых гэтымі арганізацыямі. Лічачы гэта недастатковым, мы **бярэм на сябе абавязак ахапіць 100 проц. рабочых гурткамі аўладаньня ваеннай тэхнікай,** каб быць гатовымі ў патрэбны момант уліцца ў рады Чырвонай армії.

Мы бярэм на сябе абавязак нашу пабудову ператварыць у цытадэль абароны сацыялістычнай бацькаўшчыны. Ператворым у жыцьцё лёзунг—«кожны ўдарнік пабудовы—ударнік—абароны».

Наш рабочы калектыў і Чырвоная армія—адна сям'я. Мы ведаем, што ад пасьпяховасьці і якасьці нашай працы залежыць абароназдольнасьць нашай краіны.

Мы абвяшчаем сябе ўдарнай пабудовай «імя абароны» і бярэм на сябе абавязацельства дабраякасна і ў тэрмін скончыць наш будаўнічы плян, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідаваць адставаньне, якое маецца ў тэрміне выкананьня вытворчага заданьня з прычыны недахвату кваліфікаванай рабочай сілы і будаўнічых матар'ялаў.

Выклікаем на спаборніцтва пабудову **Белдзяржтрансу.**

Па даручэньні рабочых пабудовы рабкоры: **Шыф, Лейбовіч, Гальпэрын.**

Вышэй тэмпы

ДАГНАЦЬ УПУШЧНАЕ

Завод «Дрэвааапрацоўшчык» пачынае разгортваць работу па падрыхтоўцы да манэўраў СПА. **Зборачны цэх** у сувязі з гэтым **аб'явіў вытворчыя манэўры** і выклікаў астатнія цэхі заводу. Выклік прынят.

Зьмест выкліку наступны: ліквідацыя прарываў на вытворчасьці, лепшы ўдзел у камандах СПА, 100 проц. яўка на заняткі, узмацненьне работы ўдарных брыгад. Складзен штаб кіраўніцтва манэўрамі.

М.

Манэўры рашаючага году пяцігодкі правядзем узорна

З загаду войску БВА

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі!

СССР уступіў у пэрыяд сацыялізму. Рабочая кляса, пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі Леніна, з дапамогаю ўсіх працоўных краіны саветаў і ўсяго сьвету, прыступіла да ператварэньня адной шостай часткі зямной кулі, прыступіла да зьмены твару ўсёй зямлі—да пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Наперакор ныцікам і малаверам, разьбіваючы на сваім шляху «левы» і правы апартунізм, партыя бальшавікоў, яе рулявы—слаўны ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным—разгортнутым фронтам вядзе наступленьне супроць старога грамадзтва, ліквідуючы апошнія рэшткі капіталізму ў нашай краіне.

Партыя і рабочая кляса з дня на дзень уводзіць у бой усё новыя і новыя рэзэрвы, разьвіваючы ў іх творчую энэргію, нябывалы энтузіязм, упэўненасьць у свае сілы, у перамогу сацыялізму.

Выкананьне пяцігодкі—пляну вялікіх работ—ператварылася ў пераможны паход народаў, што насяляюць СССР. У гэтым годзе пушчаюцца ў ход 518 буйнейшых фабрык і заводаў, 1040 машына - трактарных станцый, 15 мільёнаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак расталіся з спадчынай капіталізму—індывідуальнай галоднай гаспадаркай, расталіся канчаткова і безпаваротна, уступіўшы на шлях буйнай калектывізацыі гаспадаркі. На аснове суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца кляса кулацтва—апошняя апора імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі ў нашай краіне.

СССР—сьцяг сусьветнага пралетарыяту—з аграрна-індустрыяльнай ператвараецца ў краіну буйнай індустрыі, ператварылася ўжо ў краіну самай буйнай аграмаджанай сельскай гаспадаркі ва ўсім сьвеце.

СССР—гонар пралетарыяту і прыгнечаных усіх краін—з посьпехам ажыцьцяўляе лёзунг: «у найкарацейшы гістарычны тэрмін дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах».

Зусім іншы малюнак у капіталістычным лягеры, які б'ецца ў агоніі сусьветнага эканамічнага крызісу. Дзесяткі мільёнаў пралетараў з сваімі сем'ямі асуджаны на пакуты беспрацоўя і голаду. Шматмільённыя масы сялянства, якія разбурыліся, упалі ў нябачанае жабрацтва, у Польшчы, Нямеччыне, Чылі, Іспаніі, Кітаі і іншых краінах зьверскімі мэтадамі паліцэйскай расправы, расстрэламі і шыбеньніцамі, ашуканствам і здрадніцтвам сацыял-фашыстаў, капіталізм спрабуе стрымаць нарастаючыя рэвалюцыйныя хвалі пралетарскіх і сялянскіх мас, якія шукаюць рэвалюцыйнага выхаду з неражываемага крызісу, з жахаў і нэндзы капіталізму. Пераможны паход СССР па шляху сацыялізму захапляе пралетараў усяго сьвету, якія штурмуюць асновы капіталізму, паказвае ім адзіны шлях выхаду з жабрацтва і голаду.

Капіталістычная дыктатура шукае выхаду з крызісу ў новай імпэрыялістычнай вайне, у контрэвалюцыйнай інтэрвэнцыі супроць краіны будуючай сацыялізм. Пад маскай «разбраеньня» і мірных пактаў капіталістычныя краіны рыхтуюць новую бойню, якая накіравана ў першую чаргу супроць СССР.

Але-ж няхай памятаюць капіталісты грознае папярэджаньне VI-га зьезду саветаў, што **«ўзброены напад на Саюз ССР азначае цяпер галоўную небясьпеку для тых, хто паспрабуе парушыць мір і напасьці на Савецкі Саюз».**

Манэўры войска прымежнай Беларускай вайсковай акругі павінны яшчэ больш замацаваць гэту заяву зьезду саветаў, выказчыка волі шматмільённых мас працоўных вялікай краіны сацыялізму.

Манэўры павінны даказаць, што ўсе байцы Чырвонай арміі бязьмежна адданы справе Леніна, згуртаваны навакол генэральнай лініі партыі і яе ЦК, і за перамогу ідэй Леніна яны гатовы біцца да апошняй кроплі крыві.

Манэўры павінны даказаць, што чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі часьцей нашае акругі сумленна, з уласьцівай байцам Чырвонай арміі ўпартасьцю і настойлівасьцю, выканалі поўнасьцю і ўзорна загады РВС СССР па баявой падрыхтоўцы на бягучы год, тым самым узьнімаючы на вышэйшую ступень баявую моц арміі, абароназдольнасьць краіны, што яны гатовы ў любы момант стаць на абарону СССР—ударнай брыгады міжнародный рэвалюцыі.

Жалезная рэвалюцыйная дысцыпліна—гэта першы неабходны залог пасьпяховага правядзеньня манэўраў. Памятайце заўсёды словы Леніна: «Хто не падтрымлівае з усіх сіл парадак і дысцыпліну ў Чырвонай армі, той здраднік».

Войска, што прымае ўдзел у манэўрах, насычана сучаснымі тэхнічнымі сродкамі барацьбы. Захоўвайце гэту дарагую тэхніку, аўладайце ёю, не забываючы, аднак, што вінтоўка, кулямёт і гармата—асноўная і самая грозная зброя ва ўмелых руках байцоў.

Усюды, дзе-б вы ня былі,—апраўдвайце высокае званьне воіна рэвалюцыі. Усяляк дапамагайце калгасам у барацьбе супроць кулакоў, растлумачвайце палітыку партыі і савецкай улады, памятаючы, што баец Чырвонай арміі—актыўны абаронца генэральнай лініі партыі.

Таварышы!

Паўсюды вышэй трымайце сьцяг ленінскага інтэрнацыяналізму, усямерна ўзмацняйце інтэрнацыянальную сувязь працоўных усіх нацыянальнасьцей, выкарчоўвайце ўсялякія праявы нацыянальнай варожасьці, асабліва ўдараючы па праявах вялікадзяржаўнага шавінізму.

Вітаючы вас з пачаткам манэўраў, РВС БВА выказвае цьвёрдую ўпэўненасьць, што манэўры трэцяга, рашаючага году пяцігодкі байцы, камандзіры і палітработнікі правядуць узорна, па-ўдарнаму, рыхтуючы, сталёвыя рады часьцей Чырвонай арміі да надыходзячых баёў за справу Леніна, за справу сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Камандуючы войскам БВА
УБАРЭВІЧ.
Член Рэвваенсавету
АРАНШТАМ.

У ногу з Чырвонай арміяй

Раён манэўраў. 17-IX. Вялікім уздымам працоўнага энтузіязму сустрэлі рабочыя-ударнікі прадпрыемстваў гораду выхад на манэўры чырвонаармейскіх часьцей. На заводах рабочыя-ударнікі абвясьцілі ў адзнаку манэўраў Чырвонай арміі—вытворчыя манэўры па ліквідацыі прарываў, выклікаўшы далучыцца да іх усе прадпрыемствы гораду.

Пачын гэтых заводаў шырока падхапілі ўдарнікі астатніх прадпрыемстваў.

Кожнае прадпрыемства, якое ўдзельнічае ў вытворчых манэўрах, заключыла з сутаварыскімі чырвонаармейскімі часьцямі сацыялістычныя дагаворы, у якіх рабочыя бяруць на сябе рад канкрэтных абавязакаў па практычнай рэалізацыі прамовы тав. Сталіна, па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну. З свайго боку сутаварыскія чырвонаармейскія часьці бяруць на сябе рад абавязкаў па поўным і пасьпяховым выкананьні задач манэўраў і разгортваньні масавай работы сярод насельніцтва раёну. У дагаворах рабочыя ўзялі на сябе абавязкі па разгортваньні шэфскай работы. Рабочыя заводаў высылаюць брыгаду ў 100 чал. у падшэфны сельсавет.

Рабочыя, уступаючы ў вытворчыя манэўры, прынялі на сябе абавязкі: поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку, увесьці прэміяльна прагрэсыўную зьдзельшчыну. Абвешчаны новы аклік ударнікаў, прыняты абавязкі ўдагнаць за час манэўраў 120 рабочых ударнікаў у партыю, адзін цэх ператварыць у камсамольскі, паслаць брыгады на лесараспрацоўкі, арганізаваць 2 калгасы і г. д.

На адной фабрыцы ўключэньне ў манэўры ўжо дало новы прыліў 105 ударнікаў. Рабочыя фабрыкі прынялі абавязацельства поўнасьцю ліквідаваць прарывы, якія маюць месца на вытворчасьці і арганізаваць у адзнаку чырвонаармейскіх манэўраў чырвоны абоз са збожжам.

Праведзеная канфэрэнцыя ўдарнікаў вытворчасьці і Чырвонай арміі падагуліла вынікі падрыхтоўкі да манэўраў.

Манэўры зьявяцца баявым экзаменам чырвоным байцом і ўдарнікам сацыялістычнай вытворчасьці, яшчэ больш замацуюць сувязь працоўных з Чырвонай арміяй, зьявяцца новым магутным ударам па ворагах савецкай краіны, апартуністах і малаверах, ухілістах ад генэральнай лініі партыі.

Д. А.

Спатканьне Чырвонай арміі з калгасамі ператвараецца ў магутную дэманстрацыю

Раён манэўраў. 18-IX. (Белта). На першым маршы чырвонаармейцаў па брацку сустрэлі калгасьнікі. Чырвонаармейцы праводзілі гутаркі з калгасьнікамі па пытаньні зьдзельшчыны і правядзеньні асеньняй пасеўнай кампаніі і хлебазагатовак. Калгасьнікі расказвалі чырвонаармейцам аб клясавай барацьбе ў калгасах, іх посьпехах у будаўніцтве калгасу, недахопах работы. **Спатканьне калгасьнікаў з чырвонаармейцамі ператварылася ў шырокую магутную дэманстрацыю братаньня.**

Першы марш ідзе звышздавальняюча

Раён манэйраў. 18-IX. (Белта). Першы марш ідзе ўдарна. Няма ніводнага адстаючага. У часе адпачынку сярод чырвонаармейцаў праводзяцца культурна-масавыя заняткі. Асабліва чырвонаармейцы цікавяцца пытаньнем асеньняй сяўбы і ходам збожжазагатовак. **У радзе месц праходзячыя часьці сустракаюцца чырвонымі абозамі.**

Камуністы і камсамольцы на чале ўсёй работы.

Па ацэнцы камандваньня першы марш ідзе звышздавальняюча.

Кавалерысты абяцаюць вытрымаць экзамін баявой падрыхтоўкі і клясавай сьвядомасьці

(Са звароту дыв. канфэрэнцыі №-ай кав. дыв.)

Таварышы! надыходзячыя манэўры будуць праходзіць у абстаноўцы шалёнай падрыхтоўкі імпэрыялістамі ўзброенага нападу на СССР, асабліва з боку польскай і румынскай буржуазіі.

Першая задача кожнага байца, камандзіра і палітработніка, усяго дывізыйнага баявога калектыву паказаць Рэвалюцыйнаму Вайсковаму Савету нашай акругі, ураду і ўсім працоўным масам Савецкай Беларусі, што №-ская Кав. Дывізія самаахвярна адданая справе Леніна і згуртаваная вакол генэральнай лініі камуністычнай партыі і яе ЦК, выканала загады РВС Саюзу па баявой падрыхтоўцы на 1931 год і гатова ў любы момант стаць на абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Таварышы, байцы і камандзіры! Нашы манэўры будуць праходзіць на тэрыторыі Беларускай Сацыялістычнай Рэспублікі, працоўныя масы якой пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Беларусі, у ногу з усімі працоўнымі Савецкага Саюзу, гіганцкімі крокамі будуюць сацыялістычную бацькаўшчыну. Савецкая Беларусь ператвараецца ў краіну буйнай сацыялістычнай прамысловасьці, буйнага сацыялістычнага земляробства, з краіны нясьменнай—у краіну суцэльнай пісьменнасьці. Працоўныя масы Савецкай Беларусі пасьпяхова ліквідуюць на базе суцэльнай калектывізацыі апошнюю апору капіталізму ў вёсцы—кулацтва; яны разгромілі і ліквідавалі агентаў інтэрвэнцыі, беларускіх нацыянал-дэмакратаў і вядуць бязьлітасную барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам—галоўнай небясьпекай на даным этапе і шавінізмамі іншых нацыянальнасьцей.

Рабочы, калгасьнік, бядняк і серадняк—аднаасобнік будуць глядзець на байцоў дывізіі, як на перадавых, клясава-стойкіх, палітычна - пісьменных таварышоў. Будзьце гатовы апраўдаць гэта высокае давер'е працоўных!

Усямерна ўмацоўвайце інтэрнацыянальную сувязь з працоўнымі масамі Савецкай Беларусі. Выкарчоўвайце ўсякую малейшую праяву нацыянальнай варожасьці, біце па вялікадзяржаўным шавінізме, контррэвалюцыйным антысэмітызме і шавінізме.

Усім дапамагайце калгасьнікам, бедняком і серадняком аднаасобнікам у барацьбе супроць кулакоў, у рабоце па выкананьні імі хлебазагатовак, пасеўкампаніі, у арганізацыі працы і вучоту ў калгасах. Кожны баец павінен памятаць, што ён актыўны прапагандыст і абаронца генэральнай лініі партыі.

Войска выступіла для заняцьця выходнага становішча

Раён манэўраў, 18-IX. (Белта). Частка войска выступіла для заняцьця выходнага становішча. Трэба адзначыць надзвычай добрую работу сапёрных частак, якія працавалі з вялікімі энтузіязмам і праявілі вялікую настойлівасьць у часе работ па рамонту дарог і рамонту мастоў. Імі пабудаваны і адноўлены дзесяткі вялікіх і малых мастоў. Непраходныя дарогі зрабіліся зараз непазнаванымі і прыдатнымі для язды. Мясцовае насельніцтва прымае актыўны ўдзел у работах і аказвае вялікую дапамогу сапёрным часткам. Пры іх дапамозе ўжо ня відаць канаў, лужын і папсаваных дарог.

Добра працуюць каапэрацыйныя арганізацыі, яны зусім падрыхтаваны і гатовы для абслугоўваньня войска. Мясцовае насельніцтва, а ў асабліваснасьці калгасьнікі, рабочыя саўгасаў гасьцінна прымалі праходзячыя часьці Чырвонай арміі.

Лётны склад ірвецца ў паветра

Раён манэўраў, 18-IX. (Белта). (З гутаркі з памочнікам Галоўнага кіраўніка па авіяцыі тав. Кушаковым).

Манэўры гэтага году выклікаюць вялікую зацікаўленасьць усяго асабовага складу часьцей вайскова-паветраных сіл. Лётчыкі з нецярплівасьцю чакаюць сумеснай работы з іншымі відамі войска.

Лётны склад ірвецца ў паветра. Падрыхтоўчая праца ўся праводзіцца пад лёзунгам «дабіцца безаварыйнасьці». Ва ўмовах існуючага на манэўрах надвор'я (нізкая воблачнасьць, балоцістасьць і лясістасьць мясцовасьці, даж джы) ад лётнага складу патрабуецца вялікае напружаньне, каб змагчы хутка прыняць патрэбныя рашэньні. Дзякуючы праведзенай вялікай падрыхтоўчай працы каманд ваньня і палітапарату, партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі, я ўпэўнен,—кажа тав. Кушакоў,—што нават і ў даных складаных умовах паветраныя сілы ўпаўне справяцца з манэўранымі задачамі.

На манэўрах авіяцыя пакажа, што яна не дарэмна так інтэнсыўна працавала ўвесь летні пэрыяд, і што яна здолее пры ўмелым кіраўніцтве вялікіх камандзіраў вырашаць задачы сучаснага бою і аддана змагацца за справу рабочае клясы ўсяго сьвету.

Абавязковая пастанова

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

5 верасьня 1931 г. № 29. гор. Менск.

З мэтай стварэньня спрыяючых умоў для пасьпяховага правядзеньня вучэбных манэўраў каманд П. В. А., якія будуць праводзіцца ў г. Менску ў 2-ой палове верасьня г. г., Менскі Гарадзкі Савет **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць ПВА запавясьціць насельніцтва гор. Менску аб пачатку вучэбных манэўраў трывожнымі, з перапынкамі гудкамі сірэн і паравозаў і частымі ўдарамі ў гонг на працягу 10-ці хвілін, а аб часе скончэньня вучэбных трывог—гудкамі з перапынкамі на працягу 5-ці хвілін.

2. Абавязаць усё насельніцтва гораду Менску, якое ў часе паветранай трывогі будзе засьцігнута на вуліцах, плошчах, садох і г. д., захоўваць усе правілы проціпаветранай небясьпекі (захоўваючы сябе ад нападу з паветра), для чаго хавацца ў бліжэйшых дамох, пад'ездах і інш. зачыненых памяшканьнях, захоўваючы правілы руху, г. зн., трымаючыся правага боку вуліцы і не скапліцца натоўпамі.

3. Абавязаць гужавы і аўтатранспарт неадкладна зварочваць з галоўных вуліц, шляхам ад'езду на бліжэйшыя завулкі і двары, устаўляючы свае экіпажы такім чынам, каб не перашкаджаць нормальнаму руху па гэтых завулках і дварох.

4. Трамвайны рух у часе трывогі спыніць, усе пасажыры павінны пакінуць вагоны і хавацца, як указана ў п. 2 гэтай пастановы, а трамвайныя вагоны адвесьці з пераходкаў, ма сюў і найбольш бойкіх вучасткаў вуліц у спакойныя месцы.

5. Вольны праезд і праход па гораду дзе ў часе трывогі дазволіць толькі камандам ПВА, якія маюць нарукаўныя павязкі, транспарту спэцыяльных служб, вайсковым і пажарным часткам.

6. Абавязаць усе прадпрыемствы, установы, арганізацыі і дамаўладаньні ў выпадку падачы сыгналу аб паветранай трывозе ў вячэрні, або начны час неадкладна завешваць вокны цёмнымі, непрапускаючымі сьвета занавескамі, зачыніць аканіцы, або зусім тушыць сьвет.

7. Абавязаць усе прадпрыемствы, установы і арганізацыі ў часе паветранай трывогі: работы не прыпыняць, прыняўшы меры да самаабароны; спыніць прыватныя размовы па тэлефоне; неадкладна аслабаніць ад работы каманды ПВА.

Усім гандлёвым прадпрыемствам—спыніць гандаль да сыгналу адбою.

8. Масавыя сходы, тэатры, цырк, кіно, клюбы і інш. у часе паветранай трывогі працы не спыняюць, але выхад з гэтых памяшканьняў дазваляецца па сыгналу адбою.

9. Прапанаваць ПВА ўмоўна атручаныя вучасткі агарадзіць жоўтымі сьцягамі і знакамі агароджы (дыск з намалёваным чарапам і надпісам «атручаны»), забараніўшы праезд і праход праз гэтыя вучасткі да зьняцьця агароджы.

10. Вінаватыя ў парушэньні гэтай пастановы і тыя асобы, якія будуць затрыманы на вуліцах пасьля трымоўных сыгналаў, прыцягваюцца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку на месцы штрафу да 3 р., а дастаўленыя ў міліцыю—штрафу да 100 руб., або прымусовых работ да 15 дзён.

Асобы, якія будуць распаўсюджваць злосныя чуткі, або ствараць панічнічныя настроі, прыцягваюцца да адказнасьці ў судовым парадку.

11. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца на вайсковыя патрулі, міліцыю і дворнікаў.

12. Гэта пастанова ўступае ў сілу з пачатку вучэбных манэўраў.

Старшыня Менгарсавету
Валодзька.

Сакратар Гарсавету
Шэлкавец.

ПРАВІЛЫ

паводзін насельніцтва ва ўмовах паветрана-хімічнага нападу

1. Ведай сыгналы

а) **«Паветранай трывогі»—вой сырэн і паравозных гудкоў у працягу 10 хвілін з перапынкам** (да гораду ляціць авіяцыя праціўніка);

б) **«хімічнай трывогі» — мясцовыя ўдары ў жалезны гонг** (самалёты праціўніка скідваюць хімічныя бомбы);

в) **«адбой»—паветранай небясьпекі—вой сырэн і паравозных гудкоў у працягу 5 хвілін без перапынку** (паветрана-хімічнае нападзеньне адбіта).

2. Па сыгналу «паветранай трывогі»

а) калі знаходзішся на вуліцы, дык спыні рух і зайдзі ў двор ці ў дом; не хвалюйся і не мятуйся, захоўвай спакой і не стварай панікі, утрымлівай іншых ад панікі; ня вер неправераным чуткам, вядзі барацьбу з імі; маючы працівагаз, прыладзь яго ў палажэньне «на гатове». Садзейнічай усім мерапрыемствам, якія праводзяцца ў агульным парадку для абароны грамадзкага насельніцтва і саглядай дакладна патрабаваньні і паказаньні паставых міліцыянэраў і каманд ПХА.

б) Калі знаходзішся ў памяшканьні, дык прывядзі сваю кватэру ў палажэньне працівахімічнай абароны: зачыняй вокны, дзьверы, зачыняй печы і спыні апальваньне, уночы патушы агні ці зрабі іх нябачнымі знадворку, зачыніўшы вокны стаўнямі ці чорнымі занавескамі, пры наяўнасьці ў хаце абсталяванага ў працівахімічных адносінах памяшканьня ці прытулку ў першую чаргу накіроўвай туды дзяцей, жанчын і старых, калі маеш працівагаз прывядзі яго ў палажэньне «на пагатове», саглядай у дакладнасьці ўстаноўлены парадак.

в) Усялякі рух на вуліцы спыняецца, а без асаблівай патрэбы ня выходзіць з памяшканьня, ці ўкрыцьця.

3. Па сыгналу хімічнай трывогі

а) Калі знаходзішся ў неабароненым ад баявых атрутных матэрый (АМ) месцы, затрымай дыханьне, надзень працівагаз, дыхай у ім спакойна, старайся не рабіць у ім лішняга руху, а калі неабходна, дык працягвай пачатую справу.

б) Ня выходзь без працівагазу з абсталяванага памяшканьня, ці прытулку, пры пашкоджаньні працівагазу ўмей ім карыстацца ў атручаным паветры і, пры магчымасьці, замяні яго.

в) Пры паражэньні АМ, ці іншых пашкоджаньнях, прымі, па магчымасьці, тэрмінова меры неадкладнай дапамогі, і калі ёсьць неабходнасьць, накіроўвайся ў бліжэйшы пункт мэддапамогі і абмывальны пункт.

4. Захоўвай асьцярогу ў мясцох заражаных АМ тыпу «ІПРЫТУ»

а) Пры сустрэчы з заражаным вучасткам збыйдзі яго з паветранага боку і ў выпадку, калі ён не абазначаны азнакамі загароды паведамі аб гэтым паставога міліцыянэра ці пост ПНАГ, асабліва будзь асьцярожан пры сустрэчы з заражанымі вучасткамі ў жаркі час.

Пункты першай дапамогі будуць працаваць:

Абмывачны пункт пры лазьні на Кастрычнікавай вуліцы.

Пункты першай дапамогі: дзіцячы дыспансэр на Чырвонаармейскай вуліцы, трахаматозная лячэбніца, нервовая клініка, 3-ая абмуляторыя па Ракаўскай вуліцы; 1-я бальніца, 2-я бальніца, Пярэсьпянская амбуляторыя, начны санаторы і пункт першай дапамогі пры ф-цы «Камунарка».

5. У выпадку пажару—выклікай пажарных праз паставога міліцыянэра, авіяхіміка; запальны склад аэрабомб тушы пяском.

6. Пры паведамленьні аб тым, што хімічная небясьпека прайшла:

а) выходзь з памяшканьня,

б) правер у жылым памяшканьні ад сутнічаньне паху АМ і пры наяўнасьці яго адчыні вокны і дзьверы для праветрываньня,

в) ня ўжывай у страву вады ці харчовых прадуктаў, якія маюць пах АМ без паказаньня доктара,

г) не ўваходзь у заражаны раён, аба значаны знакамі заражэньня.

Гарсавет Асоавіяхіму.

Атрад „Варашылава апраўдвае сваё імя

У атрадзе імя Варашылава пры друкарні імя Сталіна занятк па супроць паветранай абароне ідуць поўным ходам.

19 верасьня збор быў 100 проц. Пра працоўвалася тэма дэгазацыі і рэальная дапамога «пацярпеўшым» ад ОВ. У супроцьгазах каманда рабіла дэгазацыю ў друкарні і наўкола яе, Работай усе вельмі цікавіліся, распарджэньні камскладу выконваліся хутка. Ад вачэй лётніка прымаліся ўсе меры перасьцярогі. Друкарня была на ваенным становішчы. Работа ішла вельмі чотка.

Па скончэньні вучобы каманда патрабавала ад камскладу займацца такой практычнай вучобай больш часта. Жанчыны праявілі асаблівую ўстойлівасьць і ў супроцьгазах працавалі нараўне з усімі.

Ш.

Апошняя дэкада верасьня

вырашае поўнае выкананьне фінпляну 3-га кварталу

Падхапіць вопыт Р.-Марымонаўскага, Шарпілаўскага і Папоўскага сельсаветаў, перавыканаўшых квартальны плян. Да адказнасьці зрыўшчыкаў фінпляну з Лоеўскага і Асьвейскага раёнаў. Мабілізаваць усе сілы на ліквідацыю прарываў у пляне фінансаваньня сацыялістычнага будаўніцтва

Напружыць усе сілы і ліквідаваць прарыў

Работа па мабілізацыі сродкаў ў Лоеўскім раёне да гэтага часу стаяла ў баку ад агульнай работы па правядзеньні чарговых гаспадарча-палітычных кампаній.

У адносінах да гэтай справы раённае кіраўніцтва паклалася на самацёк і дачакалася таго, што цяпер патрэбны надзвычайныя меры і шмат сіл, каб ліквідаваць той ганебны прарыў, які стварыўся ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў за бягучы квартал.

Дзе райкамсод?

Аднак ліквідаваць гэты прарыў будзе ня зусім лёгка, бо на працягу застаўшыхся 2-х дэкад кварталу, трэба мабілізаваць 240 тыс. руб. у той час, як спачатку кварталу і да 10 верасьня сабрана толькі 222 тысячы руб.

Раённай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе, як гэткай, у Лоеве фактычна ня існуе ўжо 3-4 месяцы. Апошняе паседжаньне гэтай камісіі адбылося яшчэ 2 чэрвеня 1931 г., але і на гэтым паседжаньні разглядаліся толькі арганізацыйныя пытаньні, зьвязаныя з правядзеньнем падпіскі на пазыку—«3-ці рашаючы год пяцігодкі».

Камісія садзейнічаньня, старшынёй якой зьяўляўся намесьнік старшыні РВК тав. Радзівіновіч, на пятым «гістарычным» паседжаньні (2-VI) закончыла сваю бязслаўную дзейнасьць.

1-VII раённая чацьвёрка па мабілізацыі сродкаў адзначыла, што раённая камісія садзейнічаньня слаба праводзіла ўскладзеную на яе работу і паставіла пытаньне перад прэзыдыўмам РВК аб роспуску гэтага складу раённай камісіі садзейнічаньня.

Аднак прэзыдыўм РВК, як відаць, палічыў, што арганізацыя камісіі садзейнічаньня ня вельмі тэрміновая справа і толькі 29 ліпеня перагледзеў склад камісіі і вылучыў новага старшыню.

„Першы раз чую аб гэтым"

Але адна справа вынесьці пастанову, а другая правесьці яе ў жыцьцё. Тэхнічны апарат РВК не давёў да ведама новага старшыні камісіі тав. Рудзяка аб тым, што на яго ўскладзен тэты абавязак. Калі 10 верасьня працаўнік Наркамфіну, шукаючы па Лоеву раённую камісію садзейнічаньня, знайшоў тав. Рудзяка і запытаўся яго аб работе камісіі садзейнічаньня, дык пачуў такі адказ:

— Зьвярнецеся да старшыні камісіі (?).

Аказваецца тав. Рудзяк каля 2-х месяцаў нават і ня ведаў аб тым, што ён зьяўляецца старшынёй раённай камісіі садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе.

— Першы раз чую аб гэтым, тут мабыць нейкая памылка, — развёў рукамі гэты «старшыня».

Памылкі не аказалася. Тав. Рудзяк не працягу больш 50 дзён ня ведаў аб тым, што ён зьяўляецца старшынёй камісіі, бо прэзыдыўм РВК не паціка віўся прасачыць за выкананьнем сваёй пастановы.

Пры падобнай бязьдзейнасьці раённай камісіі, як і трэба было чакаць, выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў зрывалася, асабліва ў частцы добраахвотных плацяжоў.

Так, на 11 верасьня па рэалізацыі пазыкі паступіла толькі 56,7 проц., па ашчадкасе чакаўся прыліў фізычных укладаў на суму 22 тысячы руб., але замест гэтага ашчадкаса за даны пэрыяд мела адліў укладаў на 2 тысячы руб.

Ня ў лепшым становішчы знаходзіцца і выкананьне пляну збору паявых узносаў па лініі каапэрацыі, дзе плян выканан толькі на 23,2 проц. За даньне па рэалізацыі акцыйнага Трактара цэнтру выканана, пакуль што, толькі на 16,7 проц., па рэалізацыі машынных абавязацельстваў на 30,2 проц.

Усё гэта гаворыць аб поўнай безадказнасьці раённага кіраўніцтва да справы мабілізацыі сродкаў.

Мала лепш абстаіць справа і з выкананьнем пляну па абавязковых плацяжох. Сваячасовае выкананьне гэтага віду плацяжоў таксама стаіць пад пагрозай зрыву, бо за 2 дэкады верасьня трэба іх дабраць яшчэ 59 проц. квартальнага заданьня.

Тры сельсаветы на справе даказалі рэальнасьць пляну

Ня гледзячы на амаль поўную бязьдзейнасьць раённага кіраўніцтва некаторыя сельсаветы ўсё-ж такі па баявому ўзяліся за выкананьне фінпляну.

Тры сельсаветы — **Р. Марымонаўскі, Шарпілаўскі і Папоўскі** — у выніку ўдарнай работы па мабілізацыі сродкаў і выкананьні фінпляну маюць бліскучыя вынікі.

Так, **Р. Марымонаўскі сельсавет выканаў квартальны плян па зборы с. г. падатку на 255,9 проц., а па страхоўцы — 106,1 проц, Шарпілаўскі сельсавет выканаў плян па с. г. падатку на 248,6 проц., па страхоўцы на 89 проц.; і Папоўскі сельсавет па с. г. падатку** на 180,5 проц., а сатрахоўка на 102;5 проц.

Зараз раённая камісія садзейнічаньня ўлічваючы надзвычай вялікую работу праробленую гэтымі сельсаветамі пастанавіла прэміраваць старшынь гэтых сельсаветаў т. т. **Кацэба, Зубкуса і Сапота Хвёдара.** Апроч таго, адпушчана ў распараджэньне прэзыдыўмаў першых 2-х сельсаветаў па 50 руб, а Папоўскага сельсавету — 35 руб. на прэміраваньне больш актыўных членаў сельсаветаў.

Нажаль такіх прыкладаў ў раёне вельмі мала. Тры сельсаветы даказалі поўную рэальнасьць пляну і магчымасьць ня толькі выканаць іх, але нават і перавыканаць. Астатнія 13 сельсаветаў ганебна адстаюць у гэтай справе, і сваёй злачынай бязьдзейнасьцю зрываюць важнейшую гаспадарча-палітычную справу — выкананьне фінпляну.

Асабліва адстаюць наступныя сельсаветы: **Дзержаўцкі**, які квартальнае заданьне па с. г. падатку выканаў толькі на 28,5 проц., а па страхоўцы— на 10,5 проц., **Лоеўскі**—выканаў плян па с. г. падатку — на 49,5 проц., а па страхоўцы — на 45,1 проц., **Бывалькаўскі** па с. г. падатку — 46,1 проц., страхоўцы — 41,3 проц. Ня лепш абстаіць справа з выкананьнем фінпляну па **Крупейскім, Перадзельскім, Ручаёўскім і Старадубскім** сельсаветах.

Наколькі безадказна адносяцца старшыні паасобных сельсаветаў да выкананьня фінпляну, можна судзіць па наступным факце. Па ініцыятыве **Лоеўскага** райпрафсавету на 12-IX пры Лоеўскім местачковым савеце была склікана нарада з удзелам членаў прафсаюзу, якія вылучаны для дапамогі савету ў ліквідацыі прарыву ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. Сабраўшыяся на гэту нараду каля 20 рабочых і служачых, прачакаўшы гадзіны тры і павінны былі ні з чым разыйсьціся, бо старшыня месцсавету тав. **Заяц** на гэту нараду не зьявіўся.

Добры пачын і ініцыятыва некалькіх дзесяткаў сумленных членаў саюзу разьбіліся аб бюракратызм местачковага савету. Між тым работа гэтага савету ганебна правальваецца ня толькі па лініі мабілізацыі сродкаў але па ўсіх астатніх галінах.

Трэба адзначыць, што пытаньнем мабілізацыі сродкаў і рэалізацыі пазыкі прафарганізацыі хаця і займаліся, але недастаткова. Гэтыя пытаньні ня ўключаны ў штодзённую працу прафсаюзаў раёну. Нават саюз фінбанкаўскіх работнікаў, які павінен-бы здаецца быць сапраўдным змагаром за выкананьне пляну, стаяў у баку ад гэтай работы.

Усебеларускі дэкаднік па рэалізацыі пазыкі, які праводзіўся з 20-VII, не закрануў увагі лоеўскіх арганізацый і ня даў належнага пералому ў гэтай работе. На паасобных прадпрыемствах і ўстановах Лоева ёсьць рабочыя і служачыя, якія яшчэ не ахоплены падпіскай на пазыку «3-га рашаючага году пяцігодкі». («Фарбацвет», райспажыўсаюз і г. д.).

Ня гледзячы на тое, што тэрмін афармленьня падпіскі скончыўся, у раёне да гэтага часу ня ўнесены і першыя ўзносы па падпісцы на пазыку (завод «Фарбацвет» і калектыў цыфрульнікаў). За сваячасовае выплатай ўзносаў па пазыцы ў раёне ніхто ня клопоціць.

На сёньняшні дзень з 86 калгасаў раёну, яшчэ 34 не далі зьвестак аб тым, ці праведзена ў іх падпіска на пазыку. Агульнае заданьне па рэалізацыі пазыкі на вёсцы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў выканана толькі на 45 проц.

Усё гэта сыгналізуе аб неабходнасьці стварэньня тэрміновага і рашучага пералому ў рабоце па мабілізацыі сродкаў ў Лоеўскім раёне. Трэба пакончыць з самацёкам, які яшчэ не ліквідаваны ў гэтай галіне работы Лоеўскіх арганізацый

Прарыў павінен быць ліквідаваны

Трэба, чаго-б то ні каштавала, дамагчыся таго, каб да 1-га кастрычніка плян мабілізацыі сродкаў па Лоеўскім раёне, быў поўнасьцю выканан.

Трэба сказаць, што цяпер раёныя прафэсыянальныя арганізацыі заварушыліся, але яшчэ не настолькі актыўна, як гэта патрэбна. На час з 4-га па 20-га верасьня накіраваны ва ўсе сельсаветы брыгады для ліквідацыі прарыву на фінансавым фронце, але на гэтым нельга супакоіцца.

Неабходна, каб раённая камісія садзейнічаньня стала сапраўдным баявым штабам мабілізацыі сродкаў, трэба каб яна кожны дзень ведала, як ідзе работа ў кожным паасобным сельсавеце, каб яна сапраўды ўзялася за баявое, апэрацыйнае кіраўніцтва гэтай работы.

Мы патрабуем, каб ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў запатрабавала ад свайго Лоеўскага мясцкому падрабязны рапарт аб тым, што гэтым мясцкомам канкрэтна зроблена па дапамозе фінапарату ў яго барацьбе за ліквідацыю прарываў.

Асаблівую ролю ў ліквідацыі гэтага прарыву на фінансавым фронце павінны адыграць сельсаветы. **Фінансавабюджэтныя сэкцыі пры сельсаветах** павінны рашуча і па баявому перабудаваць сваю работу і агрупаваўшы вакол сябе моцнае ядро актыву з калгасьнікаў, батракоў, беднаты павесьці рашучы наступ на ліквідацыю прарываў.

Прыклад і вопыт работы Р.-Марымонаўскага, Шарпілаўскага і Папоўскага сельсаветаў, якія ў выніку ўдарнай работы перавыканалі свае пляны, павінен быць падхоплены і скарыстаны ўсімі сельсаветамі Лоеўшчыны.

С. Мікуцкі.

Ліквідаваць прарыў у Ельшчыне

Работа па мабілізацыі сродкаў ў Ельскім раёне ідзе ганебнымі тэмпамі.

Напрыклад, касы ашчаднасьці, зусім, ніякай работы па мабілізацыі сродкаў не праводзяць, у выніку чаго замест прыліву укладаў у касах ашчаднасьці наглядаецца адліў. Так, ад пачатку кварталу і да 10 верасьня з кас ашчаднасьці ўзята ўзносаў на суму 8.960 р., а прыліву зусім ня было.

Крыху лепш справа з паявымі ўзносамі ў райспажыўсаюзе, але і тут наглядаецца самацёк, у выніку чаго квартальны плян на 10 верасьня выкананы на 24 проц.

Квартальнае заданьне па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру па Ельскім раёне выканана на 36 проц., па рэалізацыі абавязацельстваў Сельгасснабу— на 12 проц., рэалізацыі пазыкі — на 40,2 проц.

Лепш абстаіць з паступленьнем абавязковых плацяжоў. Квартальнае заданьне падатку выканана на 94,3 проц. па страхоўцы на 84,2 проц.

Але-ж гэта не гаворыць яшчэ аб тым, што па падатку і страхоўцы ўсё абстаіць добра. Яшчэ ёсьць шмат недаімшчыкаў і па гэтых плацяжох, асабліва сярод кулацка - заможнай часткі вёскі. Рашучых мер да поўнага спагнаньня абавязковых плацяжоў са злосных неплацельшчыкаў яшчэ не прынята.

Трэба паклапаціцца РК КП(б)Б і РВК, каб квартальны плян да 1 кастрычніка быў выканан і перавыканан.

Брыгадзір **«С. Б.» Дзямешчанка.**

Зрабіць круты пералом у рабоце ашчадкас Бягомльшчыны

Ня гледзячы на тое, што да сканчэньня III-га кварталу засталіся лічаныя дні, плян мабілізацыі сродкаў па Бягомльскім раёне выконваецца зусім слаба. За першую дэкаду верасьня выкананьне квартальнага пляну складае 27 проц.

Асабліва слаба праводзіцца работа па ўцягненьні новых укладчыкаў у ашчадкасу. Квартальны плян гэтай работы выканан на 24 проц. У раёне ашчадсправа зьяўляецца яшчэ забытым вучасткам работы. Раённыя арганізацыі на гэту справу ніякай увагі не зьвяртаюць, быццам ашчадсправа ня іх справа.

Райашчадкаса не забясьпечана належным памяшканьнем, РВК на работу ашчадкасы наогул мала зьвяртае увагі.

Бягомльскі РК КП(б)Б, таксама, як відаць, недаацэньвае работу ашчадкас.

Г. Іваноў.

Ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна—

магутная зброя перабудовы савецкага апарату

Перавод на зьдзельшчыну і прэміяльную аплату працы— лепшы сродак для ўзьняцьця работы саўапарату

Адозва

нарады прадстаўнікоў цэнтральных установаў і прадпрыемстваў г. Менску, якая адбывалася пры НКПБ 12 верасьня 1931 г. па пытаньні аб пераводзе апарату дзяржаўных і гаспадарчых установаў на простую зьдзельшчыну і пачасова-прэміяльную аплату працы. Да ўсіх работнікаў ТНБ, рацыяналізатараў, галоўбухаў і ўсіх работнікаў кіраўнічага апарату дзяржаўных, гаспадарчых і каапэрацыйных прадпрыемстваў і установаў БССР

Гістарычнай прамовай тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў пастаўлен шэраг задач у справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Гэтыя задачы з вялікім энтузіязмам ажыцьцяўляюцца рабочымі масамі, на падставе шырока разгарнуўшысу сацыялістычных форм працы: сацспабор ніцтва і ўдарніцтва, увядзеньне зьдзельнай аплаты працы, увядзеньне гаспадарчага разрахунку ў цэхах, брыгадах, зьнішчэньне абязьлічкі і г. д.

Гэтыя формы працы зьяўляюцца тымі магутнымі рычагамі, пры дапамозе якіх, краіна будуючагася сацыялізму перамагае пад кіраўніцтвам партыі адну вышыню за другой у шляху сацыялістычнага наступленьня.

За апошнія гады партыя і Урад дабіліся значных посьпехаў у справе паляпшэньня савецкага апарату, асабліва дзякуючы праведзенай чыстцы апарату, вылучэньня ў склад апарату рабочых вытворчасьці і ўнядрэньня сацсаймяшчэньня.

Новая абстаноўка і новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва ставяць буйнейшыя задачы перад дзяржаўным апаратам. Дзяржапарат, які зьяўляючыся ў руках пралетарыяту зброяй для ажыцьцяўленьня яго клясавае палітыкі на кожным этапе сацыялэістычнага будаўніцтва, павінен адпавядаць тым запатрабаваньням, якія яму прад'яўляюцца ў даны момант.

Аднэй з прычын недахопаў нашага апарату зьяўляецца тая ўраўнілаўка ў аплаце працы работнікаў апарату, якая ў сучасны момант існуе і якая ня толькі не стымулюе прадукцыйнасьці работы, ня толькі ня спрыяе самазамацаваньню асноўных кадраў работнікаў ва ўстанове, ня толькі не дапамагае вырашэньню лепшых ударнікаў-энтузіястаў складу работнікаў,—а час та параджае бездадказнасьць, павялічвае выдаткі на утрыманьне апарату і прыводзіць да іншых нездаровых зьявішч у пастаноўцы работы ўсіх зьвеньняў дзяржаўнага і гаспадарчага апарату (несваячасовае выкананьне дырэктыў партыі і Ураду, значнае спазьненьне ў тэрміновай і пэрыядычнай справаздачнасьці, дрэнная абслугоўваньне вытворчасьці і рабочых мас, лятунства, масавае сумяшчэньне адразу ў некалькіх установах, якое прымае ўродлівую форму і г. д.).

Таму, мы, прадстаўнікі ўстаноў і прадпрыемстваў гор. Менску, лічым сваячасным і ўпаўне неабходным паступовы перавод дзяржаўнага і гаспадарчага апарату на сыстэму простай зьдзельшчыны і пачасова - прэміяльнай аплаты працы. Ухваляючы ініцыятыву Наркампрацы БССР і ЦСПСБ па пераводу апарату на паказаную сыстэму аплаты, мы бярэм на сябе абавязкам дапамагчы органам працы і прафсаюзным арганізацыям у практычным правядзеньні гэтага мерапрыемства: у прыватнасьці, абязуемся—не пазьней 1-га лістапада г. г. распрацаваць па ўстановах і прадпрыемствах, у якіх мы працуем:

а) дакладныя схэмы абавязкаў кожнай часткі апарату і кожнага работніка ў паасобку;

б) нормы нагрузкі і паказчыкі прадукцыйнасьці працы кожнага работніка апарату;

в) прыкладны парадак і формы аплаты працы (расцэнкі);

г) парадак прэміяваньня і іншыя заахвочваючыя формы за выкананьне і перавыкананьне ўстаноўленых паказчыкаў па рабоце.

Разам з гэтым мы заклікаем ТНБістаў, рацыяналізатараў, спэцыялістаў і ўсіх работнікаў дзяржаўных, гаспадарчых і каапэрацыйных установ і прадпрыемстваў пасьледваць нашаму прыкладу і зараз уключыцца ў гэту работу.

Мы ўпэўнены, што ўкараненьне новай сыстэмы аплаты працы служачым дапаможа рашучаму палепшаньню якасьці работы апарату, правядзеньню пастаўленых задач, а таксама палепшыць матэрыяльнае становішча работнікаў апарату.

У пэрыод вялікай сацыялістычнай будоўлі, мы работнікі савецкага апарату будзем разам з рабочай клясай, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі рапуча змагацца за бальшавіцкія тэмпы і якасьць работы. Мы абязуемся перагледзець усю сваю работу на базе задач пастаўленых правадыром камуністычнае партыі т. Сталіным.

Да гэтага заклікаем усіх работнікаў устаноў БССР.

Да 1-га кастрычніка 1931 г. чакаем адказу праз мясцовы і цэнтральны друк ад грамадзкіх арганізацый і калектываў работнікаў устаноў БССР аб праведзеных імі мерапрыемствах.

Удзельнікі нарады.

Удзельнікі нарады: **Пэрэльман, Віленскі, Кірыльчык, Кондэр, Кейлес, Сьвірноўскі, Могіленскі, Марголін, Балоцін, Вайнштэйн, Рутэнбэрг, Дыбоўскі, Айзэнштат, Гольдбэрг, Анодзін, Борлін, Сьвірноў, Шрайбан, Розэнбэрг, Жытомірскі, Гэраўкер, Самонаў, Качаўскі, Зільбэрбэрг, Вайн, Краснапёрка, Саракавец, Шапіро, Вансовіч, Грандо, Коткін, Дзехцяроў, Бэнэнсон, Нейштат, Шапіро, Каган, Панкраў; Каплан, Круглеўскі, Адам і Каменштэйн.**

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

па дакладу НКПрацы аб становішчы плянавай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы

Заслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Працы аб становішчы плянавай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў, Прэзыдыум ЦВК БССР адзначае, што буйныя тэмпы разьвіцьця прамысловасьці і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, пераход на бесперапынны вытворчы тыдзень і 7-мі гадзінны рабочы дзень прамысловасьці і транспарту стварылі магчымасьць цалкам ліквідаваць беспрацоўе ў БССР, як і ў СССР і запатрабавалі арганізавана-плянавага забясьпечаньня кваліфікаванай рабочай сілай прамысловасьці і іншых галін народнае гаспадаркі.

У гэтых умовах асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на пытаньні плянавай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў праз ФЗВ, ШУМП, ЦПП, сыстэму ДРА і плянавую перасоўку з ніжэйшай у вышэйшую кваліфікацыю.

У выніку практычнага ажыцьцяўленьня дырэктывы Ураду Саюзу ССР і Ураду БССР на працягу 1-га паўгодзьдзя 1931 г. дасягнуты наступныя посьпехі:

а) па ФЗВ набор вучняў складае 3.467 чалавек і выпуск 574 ч.;

б) па ўсіх відах курсавой падрыхтоўкі наборам ахоплена 58.165 чал. і фактычна выпушчана за гэты тэрмін 42.975 чал., у тым ліку: брыгадзіраўкалгасьнікаў для веснавой сяўбы— 11.067 чал. і для ўборачнай кампаніі— 16.200 чал.;

в) камплектаваньне ФЗВ і ЦПП ахоплена профадборам і профкансультацыяй, якія садзейнічаюць пасьпяховасьці самой падрыхтоўкі.

Побач з гэтымі дасягненьнямі, ёсьць яшчэ наступныя недахопы:

а) Па паасобных галінах народнай гаспадаркі да гэтага часу не па ўсіх відах падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў складзены пляны; па ВСНГ адсутнічае плян па паскорных формах падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі; па Наркамзему адсутнічае плян падрыхтоўкі праз ФЗВ і саўгасвучы, дзякуючы чаму да гэтага часу зусім ня складзены зводны рэспубліканскі плян падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі масавых кваліфікаваных кадраў і перасоўкі на вышэйную кваліфікацыю;

б) існуючая сыстэма кароткa-тэрміновай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі па паасобных галінах народнай гаспадаркі не забясьпечвае адпаведнай якасьці і пасьпяховасьці праходзячых яе рабочых, дзякуючы адсутнічаньню правільнага выкарыстаньня мэтадаў ЦПП'у;

в) адзначаючы маючыяся дасягненьні ў плянавасьці камплектаваньня ФЗВ і ЦПП, усё-ж некаторыя ведамствы не забясьпечылі ажыцьцяўленьня намечаных плянаў у галіне падрыхтоўкі адпаведнага кантынгенту для камплектаваньня ФЗВ. Так, Наркамасьветы недавыканаў па дазавучу з 3.500—1700 чал. і не забясьпечыў датэрміновага выпуску пераросткаў з 7-мі годак. Акрамя таго камплектаваньне курсавой падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі праводзіцца яшчэ самацёкам і не наладжана сваячасовая падрыхтоўка кантынгентаў для запаўненьня курсаў;

г) самацёк укамплектаваньня прадпрыемстваў у напрадрэзе, недастатковая ўвага да гэтай работы з боку гарсаветаў, недастатковая палітычная апрацоўка курсаў масавай кваліфікацыі і перакваліфікацыі;

д) матар'яльная база ўсёй сыстэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі рабочае сілы—застаецца нездавальняючай. Выкладчыкамі і інструктарскім пэрсаналам забясьпечанасьць нездавальняючая ні ў колькасных ні ў якасных адносінах.

Самая падрыхтоўка і перападрыхтоўка праводзіцца без дастатковай сувязі з вытворчасьцю: ня ўсе ФЗВ прымацаваны да пэўных прадпрыемстваў (Менск—ФЗВ Швэйнікаў, Гомель—ФЗВ Мэталістаў); ЦПП да гэтага часу не правёў поўнасьцю падрыхтоўку рабочае сілы на вытворчасьці.

Сыстэма стыпэндый пабудавана па прынцыпу ўраўнілаўкі і не ўключае ў сябе элемэнтаў пабуджэньня да хутчэйшага і больш пасьпяховага сканчэньня курсу падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі.

У мэтах забясьпечаньня пасьпяховага разьвіцьця народнае гаспадаркі належнымі кваліфікаванымі кадрамі рабочых і выніжэньня паказаных недахопаў у іх падрыхтоўцы, Прэзыдыум ЦВК БССР пастанаўляе:

1. Выходзячы з таго, што агульнай сыстэмай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў рабочых для ўсіх галін народнай гаспадаркі зьяўляецца ФЗВ і для кваліфікацыі і перакваліфікацыі рабочых грунтоўнай формай зьяўляюцца ўсе віды ДРА, даручыць НКПрацы і гаспадарчым арганізацыям усю сыстэму падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі рабочых кадраў арганізаваць на базе непасрэднай сувязі з вытворчасьцю.

2. Даручыць усім гаспадарчым арганізацыям у тэрміны, вызначаныя для складаньня кантрольных лічбаў на 1932 г., склясьці пляны разгортваньня сеткі па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы, пры чым у плянах прадугледзіць колькасьць па паасобных спэцыяльнасьцях, вылучэньне пэўных вытворчых баз, неабходнае будаўніцтва, абсталяваньне і крыніцы пакрыцьця выкладчыкамі і інструктарскімі кадрамі.

Даручыць Дзяржпляну, разам з Наркампрацы і Наркамасьветы, склясьці зводны плян падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў па БССР на 1932 год.

3. Наркамасьветы забясьпечыць выпуск адпаведнай колькасьці вучняў па ўсёй агульна-навучальнай сыстэме: 7-мі годкі; паскораны выпуск пераросткаў, дазавуч, для ўкамплектаваньня ФЗВ і ШУМП.

Наркампрацы выявіць ўсе маючыяся кантынгенты для ФЗВ і ШУМП як у горадзе, так і ў асаблівасьці на вёсцы, забясьпечыўшы належны сацыяльна-клясавы склад набіраемых і неабходны процант нацыяналаў і жанчын.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**
Сакратар ЦВК БССР **М. Гнілякевіч.**
5 верасьня 1931 г.

Апартуністычная бязьдзейнасьць замест бальшавіцкай работы

СЯННО.

Вярбоўка па Сеньненскаму раёну праходзіць вельмі марудна. Калгасы адмаўляюцца адпускаць тых калгасьнікаў, якія жадаюць ехаць на Донбас, матывуючы гэта тым, што ім самім быццам не хапае рабочых рук. Калгасы раёну не выконваюць разьвёрсткі РВК і Райкалгассаюзу.

Вельмі значным тормазам у справе вярбоўкі зьяўляецца адсутнасьць належнай дапамогі з боку мясцовых арганізацый.

Вярбоўка рабочых для Донбасу, якая зьяўляецца адным з лепшых форм сацыялістычнай дапамогі калгасных мас сялянства сацыялістычнай прамысловасьці, выклікала актывізацыю дзейнасьці антысавецкіх элемэнтаў. Лятуны і шкурнікі дэзэртыравуцыя з вугальнага фронту і вярнуўшыяся з Донбасу, разам з кулаччом распаўсюджываюць беспадстаўныя, антысавецкія чуткі аб тым,—што на Донбасе быццам, вельмі дрэнна стаіць справа харчовага забясьпечаньня і бытавога абслугоўваньня. Гэтым чуткам не даецца належны адпор, дзякуючы чаму яны дрэнна ўплываюць на некаторую, несьвядомую частку калгасьнікаў, якія не адважываюцца ехаць на Донбас.

Раённая парт. арганізацыя, Райвыканком, парт. ячэйкі і с-с. павінны зараз-жа мабілізаваць усю партыйную савецкую грамадзкасьць раёну і даць рашучы адпор кулаччу і дэзэртырам працоўнага фронту, якія імкнуцца сарваць забясьпячэньне рабочай сілай Донбасу.

Матвеяў.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

«Беларускае паўнамоцнае прадстаўніцтва «Правды» і рэдакцыя газэты «Зьвязда» арганізуюць з 20-га па 25-га верасьня ўсебеларускі рэйд ударнікаў «Правды» і «Зьвязды» па пытаньні рэалізацыі ўраджаю гародніны і садавіны.

Ударнікамі будзе праверана работа загатоўчых арганізацый, калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы, транспартных арганізацый, хавальняў і пераапрацоўчых пунктаў па арганізацыі ўборкі, загатоўкі, перавозкі, пераапрацоўкі, хаваньня садавіны і гародніны, а таксама праца спажыўкаапэрацыі па давядзеньні садавіны і гародніны да рабочага спажыўца.

Ударнікі «Правды» і «Зьвязды», усе рабселькоры і ўдарнікі друку, уключайцеся ва ўсебеларускі рэйд па рэалізацыі ўраджаю гародніны.

Беларускае паўнамоцнае прадстаўніцтва «Правды».
Рэдакцыя «Зьвязды».

23-IX, а 7-ай гада. ўвечары адбудзецца нарада кіраўнікоў лёгкай кавалерыі супольна з актывам ЛК Менску ў памяшканьні ЦКК-НКРСІ (Савецкая, 55, першы паверх, Бюро Скаргаў).

Яўка абавязкова.

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ

19-IX г. г., а 7-й гада. увечары ў Доме Працасьветы адбудзецца антырэлігійны вечар. Даклад праф. Валабрынскага.

Мастацкая частка.
Уваход па членскіх білетах.

Гарпраўленьне

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Па-ўдарнаму змагацца за ажыцьцяўленьне дырэктывы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе

Да ўсіх ударнікаў-асьветнікаў БССР

Вялізарнае палітычнае значэньне гістарычнай пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе зьяўляецца моцнай зброяй у руках пралетарыяту для разгортваньня далейшага пасьпяховага наступу на фронце культурнага будаўніцтва.

У выкананьні гэтай баявой праграмы дзейнасьці пачэснае месца павінен заняць асьветнік і ў першую чаргу асьветнік-ударнік, цэнтральная фігура асьветніцкай арміі.

Зьлёт менскіх ударнікаў-асьветнікаў, абгаварыўшы пастанову ЦК УсеКП(б) намеціў цэлы рад практычных мерапрыемстваў і прыняў на сябе канкрэтныя абавязкі па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б).

Мы зварочваемся да ўсіх ударнікаў культфронта БССР стаць актыўнымі ўдзельнікамі ў выкананьні пастановы ЦК нашай партыі, даючы рашучы адпор усім тым, хто захоча перашкодзіць нам у выкананьні гэтага гістарычнага заданьня.

Папулярызацыя і давядзеньне пастановы да ўсіх рабочых, калгасьнікаў, асьветнікаў, вучняў, барацьба за паляпшэньне якасьці нашай працы, барацьба за інтэрнацыянальна-клясавае выхаваньне падрастаючага пакаленьня, перабудова працы культасьветных установаў тварам да сацыялістычнага будаўніцтва,—вось задачы, на выкананьне якіх павінен быць накіраваны ўдар ніцкі рух сярод асьветнікаў.

У мэтах ажыцьцяўленьня пастановы ЦК УсеКП(б) і культпляну 1931-32 навуч. году, Менскія асьветнікі ўступаюць у сацыялістычнае спаборніцтва з асьветнікамі Смаленску.

Мы зварочваемся да ўсіх асьветнікаў - ударнікаў БССР, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва для ажыцьцяўленьня стаячых перад намі задач у сувязі з пастановай ЦК.

Асьветнікі БССР! выпрабаванымі сацыялістычнымі мэтадамі працы ўперад за аўладаньне вышынямі культурнай рэвалюцыі.

Няхай жывуць Ленінскія ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б—кіраўнікі і арганізатары пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва!

ТЭАТР-КІНО-ЦЫРК

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР — 19 і 20 верасьня то ькі 2 гастролі праездам з замяжы засл. арт. рэспублікі **ЭРДЭНКО**
Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г.
У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

ДЗЯРЖЦЫРК — АПОШНІЯ ДНІ
Лепшыя ў СССР Клео Дароці, жанчына ілюзіяністка. Заслужаныя артысты ССРГ бр. Танці. Муз. сат. замежная артыстка Вольга Малава. Жанглёры-малабарыстых Бэуман і Мяцёлкін. Лепшыя ў СССР атракцыёны—суцьветны рэкорд—плаваньне ў паветры 6 Эльворці 6. Вышайшае дасягненьне эквілібрыстыкі 2 Голядзе 2. 5 Богадэ 5 акрабаты. Турністы 3 Марое 3.
Новая групавая дрэсыроўка коней А. В. Лапінда.
Выезд негрыцянскіх наезьнікаў жакеяў 4 КУК 4 | Музычны Інструмэнталісты Вероніка | Выезд наезьніка Пэрвіль | Спарт. акрабаты Веомаш
Унівэрсальныя артысты бр. МАКЕЕВЫ
Каса ад 12 гадз. дня. Білеты са скідкай у рабочай касе Пач. а 8 з пал. г.

Кіно-тэатр Культура — З 10 верасьня вялікі замежны мастацкі фільм вытворчасьці праматаўс.—фільм. вып. 1931 г. „Шчасьце матуі Краузэ" ў 7 част. Рэж. і апэр. Піль-Ютун.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Мастацкі фільм **ХАЗ ПУШ** Пачатак дзённага сэансу а 2, 3-30, веч. а 7, 8-40, 10-30.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ" — Мастацкі фільм „РЭЙС МІСТЭРА ЛЛОЙДА" звыш програмы Бронепезгн к. Пач. а 2 гадз.

„Чырвоная Зорка" — Гукавы фільм **Адна** Пачат. а 7, 8 45, 10-30 гадз. Каса адч. з 5 г.

Гомельскі хэміка-тэхнолёгічны тэхнікум грамадзкага харчаваньня
ПРАЦЯГВАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЕМ студэнтаў
на 1 асноўны і на падрыхтоўчы курс
Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі ў галіне грамадзкага харчаваньня (тэхнікаў-эканам стаў, тэхнікаў-лябарантаў, тэхнікаў-тэхнолёгаў)
На асноўны курс прымаюцца асобы, з ведамі за сямігодку, ва ўзросьце 17—30 год. Для нясконча ўшых сямігодку або скончыўшых такія раней 1929 г. утвараюцца прыймовыя іспыты. На падрыхтоўчы курс прымаюцца асобы з ведамі за 5-6 груп сямігодкі.
Прынятыя ў тэхнікум будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам, як і ў іншых індустрыяльных тэхнікумах.
Да заявы прыкладаюцца дакументы пералічаныя [illegible] ў тэхнікумы. Заявы прымаюцца да 25 ве[illegible] Дакументы [illegible] ваць па адрасу: Гомель, Л[illegible]шчынская вул. 4, Дырэктару тэхнікуму БЕЛКАЛАЗАРЧ

КОШТ публікацыі аб'явы [illegible] 1 р.

У панядзелак 21-га верасьня г. г. роўна а 5 гадзіне ўвечары ў памяшканьні залі паседжаньняў Гарсавету (Пляц Волі, № 4, 3-ці паверх) АДБУДЗЕЦ